© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA“ („VATERLAND“)

Herausgeber: Wladimir BORTNIK
Die Administration: München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

Druck: „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 8, Rosenheimer Str. 46 a

Цана паза Нямеччынай: ЗША — 15 цэнтаў, Канада — 15 ц., Ангельшчына — 1 шылінг, Францыя — 40 фр., Бэльгія — 5 фр., Аўстралія — 1 шылінг, Аргентына — 2 пэзо. У іншых краінах раўнавартасьць 15 ам. цэнтаў. Падпіска на год — з разьліку 52 нумароў, на паўгода — 26 нумароў, на 3 месяцы 13 нумароў паводля вышэйшае цаны. Цана лётніцкай поштай у заакіянскія краіны — 30 ам. цэнтаў. — Падвойныя нумары каштуюць падвойна

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND“

№ 49 (180) | Нядзеля 13 сьнежаня 1953 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ 7

Бэрмудзкая Канфэрэнцыя

СПРЫТНЫ МАНЭЎР КРЭМЛЯ

Хопіць толькі прыпомніць вялікія падрыхтаваньні да канфэрэнцыі на Бэрмудах яшчэ ў травені сёлета і тыя надзеі, якія пакладалі на яе заходнія дэмакрацыі, а разам зь імі і ўсе паняволеныя бальшавізмам народы, каб зразумець яе вялізарнае значэньне для ўсіх волялюбных народаў. Факт яе адлажэньня ў наяўнасьці чэрвенскіх антыбальшавіцкіх маніфэстацыяў з мэтаю дакладнейшага вывучэньня нутранай палітычнай сытуацыі ўсходняга блёку пацьвярджае, што Бэрмудзкая канфэрэнцыя мела даць разьвязку ўсіх важнейшых праблемаў як эўрапэйскага, гэтак і сусьветнага маштабу. Публічная апінія Захаду спадзявалася, што гэная канфэрэнцыя паставіць кропку над «і» ў пытаньні далейшых дачыненьняў Захаду да Савецкага Саюзу. Савецкая нота з 3 лістапада сёлета, здавалася, канчальна скансалідавала палітычную апінію Захаду. Няўступлівы й пагражаючы характар гэнае ноты змусіў не аднаго палітыка сур'ёзна прызадумацца што да далейшых дачыненьняў з Савецкім Саюзам. Цьвёрды характар савецкае ноты не пакідаў іншае альтэрнатывы, як саліднае задзіночаньне сілаў заходніх дэмакрацыяў і зайграньне такім козырам, якім мела-б быць задзіночаная Эўропа зь сільнай эўрапэйскай арміяй, уключаючай у сябе і нямецкія дывізіі.

Апазыцыя Францыі ў дачыненьні да эўрапэйскай арміі здавалася слабець. Здавалася, што разумная палітыка ЗША, якія зьяўляюцца аснаўным маторам кансалідацыі і ўзмацненьня ваеннага патэнцыялу Заходняй Эўропы, узяла верх над страўсінай палітыкай хаваньня галавы ў пясок заходня-эўрапэйскіх дзяржаваў. Але адначасна бальшавікі выказалі больш палітычнага спрыту і зарыентаваліся ў нястойкасьці палітыкі Францыі, калі ўсадзілі свой кол у эўрапэйскі муравейнік сваей нотай з 26 лістапада сёлета амаль на пярэдадні Бэрмудзкай канфэрэнцыі. Эфэкт быў надзвычайны. Ужо ўстаноўленая праграма Бэрмудзкай канфэрэнцыі мусіла быць перагледжаная. У Францускім парляманьце ўзрасла апазыцыя да эўрапэйскай арміі. Ангельскія палітычныя дзейнікі, прыхільнікі мяккай палітыкі да Савецкага Саюзу ўздыхнулі з палёгкай. Яны схапіліся за савецкую прапанову адбыцьця канфэрэнцыі чатырох міністраў замежных справаў бязь ніякіх перадумоваў, як за апошнюю дошку ратунку. Міраж канфэрэнцыі чатырох, якая на падставе мінулаў практыкі магла быць толькі неабаснаванай надзеяй знайсьці нейкі выхад з сытуацыі шляхам перагавораў з Савецкім Саюзам, паставіў у цень Бэрмудзкую канфэрэнцыю.

ЗЬ ВЯЛІКАЙ ХМАРЫ МАЛЫ ДОЖДЖ

Паміж 4 і 8 лістапада адбылася канфэрэнцыя трох на Бэрмудах. Хопіць аднак уважліва прачытаць канцавы камунікат, каб пабачыць, што гэная канфэрэнцыя не апраўдала пакладаных ў ёй надзеяў. За выняткам узгадненьня адказу на савецкую ноту з 26 лістапада, ніякія канкрэтныя справы ня былі палагоджаныя пазытыўна. Такія важныя пытаньні, як справа эўрапэйскай арміі, палітычнае задзіночаньне Эўропы, узбраеньне і ўключэньне Заходняй Нямеччыны ў вабаронны ланцуг заходняе гэмісфэры, задзіночаньне Нямеччыны, пытаньне палітычнай карэйскай канфэрэнцыі, як і наагул праблемы Далёкага Ўсходу асталіся ня толькі не разьвязанымі, але набралі яшчэ больш туманнага характару. Успомнены камунікат робіць уражаньне літаратурнага твору, які намагаецца прыгожымі словамі пакрыць вялікую пусьціню. Пасьля доўгага й прыгожага з мастацкага гледзішча ўступу, мы знаходзім такія «рэвэляцыі», што «адзінства нашых сілаў (г. зн. заходніх дэмакрацыяў) зьяўляецца найлепшай гарантыяй міру й бясьпечнасьці». Быццамбы аб гэтым сьвет і ня ведаў?! Далей сказана, што «Паўночна-атлянтычны пакт астаецца базай нашай супольнай палітыкі» (хіба-ж была нейкая іншая палітыка?), што «эўрапэйская армія зьяўляецца неабходнай дзеля ўзмацненьня Атлянтычнага пакту» (быццам-бы гэтага ніхто ня ведаў?), што «мы ўзгоднілі адказ на апошнюю савецкую ноту і надзеімся, што канфэрэнцыя чатырох разьвяжа праблему задзіночаньня Нямеччыны і аўстрыяцкае пытаньне». Прыгожыя ілюзіі, у якія хіба найменш верацъ самі аўтары камунікату. Далей даведваемся, што «нашай мэтай ёсьць скліканьне палітычнай канфэрэнцыі дзеля разьвязаньня справы міру ў Карэі». Шляхотная мэта! Напасьледак чытаем, што канфэрэнцыя вітае гэраічныя сілы Францыі, Камбоджы, Ляёсу й Ветнаму ў іхным змаганьні за незалежнасьць супраць камуністычнай агрэсіі. І што болей? Абсолютна нічога!

Гара нарадзіла мыш, — робіць вывад француская прэса. «Фігаро» цьвердзіць, што з гледзішча турыстычнага канфэрэнцыя поўнасьцю ўдалася, бо ўдзельнікі маглі раскошна купацца ў моры на пару тыдняў перад Калядамі. Толькі, на вялікі жаль, ён забываецца, што ў гэтым у найбольшай меры вінаватая Францыя.

У ЧЫМ ПРЫЧЫНА МІЗЭРНЫХ ВЫНІКАЎ?

Трэба прыпушчаць за «Ньюс Кронікль», што Дальлес намагаўся ўсімі спосабамі, каб адсунуць канфэрэнцыю чатырох да тае пары, пакуль Захад ня будзе мець моцнага козыру ў руках у выглядзе эўрапэйскай арміі зь нямецкімі дывізіямі. У гэтай галіне яшчэ надоўга перад канфэрэнцыяй амэрыканскія палітычныя дзейнікі рабілі надлюдзкія высілкі, але ня здолелі зрэалізаваць сваіх зусім правільных плянаў. Іхная зусім правільная палітыка маніфэстацыі сілы ў дачыненьні да Савецкага Саюзу пацярпела да пэўнае меры няўдачу, напаткаўшыся на аморфнае, калі не яшчэ горг-

(Заканчэньне на 2-ой балоне)

Хвальшывае разуменьне бальшавізму

Найвялікшай памылкай людзей Захаду зьяўляецца тое, што бальшавізм з усім ягоным злом яны ацэньваюць у вадарваньні ад тае этнічнае глебы, на якой ён зрадзіўся, і незалежна ад тых гістарычных працэсаў, якія надалі яму дынамічную сілу разьвіцьця. Паколькі аснаўной рысай бальшавіцкае сыстэмы зьяўляецца дыктатура, многія вяжуць яе з асобаю самога дыктатара, уважаючы, што ізь сьмерцю гэтага дыктатара, аўтаматычна разваліцца й заведзеная ім сыстэма. На пацьверджаньне сваіх прыпушчэньняў людзі гэныя любяць шукаць аналягічных зьявішчаў у гісторыі: ізь сьмерцю Александра Македонскага, Чынгіс-Хана, Напалеона ды, калі ходзіць пра найсьвяжэйшы прыклад, навет Гітлера беспаваротна скончыліся рэпрэзэнтаваныя імі сыстэмы. Людзі гэтыя, на жаль, забываюцца, што ў Савецкім Саюзе ёсьць іначай. Ані сьмерць Леніна, ані Сталіна ня прынесла ніякіх аснаўных зьменаў. І мы пэўныя, што і па сьмерці Маленкава палітычны кірунак у Савецкім Саюзе, незалежна ад таго, як ён будзе называцца, астанецца той самы. А калі зірнём назад у гістарычную мінуўшчыню Расеі, дык пабачым, што такія Леніны, Сталіны і пад. у ёй ня зводзіліся ад часоў Івана Грознага ніколі.

Іншыя ўважаюць, што бальшавізм зьяўляецца свайго роду хваробай эпохі, хваробай няўхільнай, але часовай і пераходнай. Але калі прааналізаваць усе галоўныя рысы бальшавізму, дык у большай ці меншай меры, у тэй або іншай іх форме мы іх знойдзем ўва ўсей расейскай гісторыі. Адзін з найфанатычнейшых абароньнікаў пагляду, што бальшавізм — гэта не Расея, аўтар палітыкі «паўстрымоўваньня» Жорж Кэннан, пад націскам нязьбітых фактаў быў змушаны запярэчыць сваей собскай тэорыі, калі 24 жнівеня сёлета ў ньюерскім тыднёвіку «Нью Лідэр» пісаў: «Замежныя аосэрватары зраблілі ў Вялікім Маскоўскім Княстве шмат спасьцярогаў, якія цяпер — рэтраспэктыўна — маюць некаторыя прарочыя азнакі. Увыпукляюцца рысы даўнейшай Масквы, якім было суджана пазьней адыграць выдатную ролю псыхалягічных асноваў паўстаньня савецкай улады. Была там тады тэндэнцыя да мэсіяністычнага разуменьня гістарычнай ролі Масквы, неталеранцыя ў дачыненьні да чужаземнага выгляду і чужых паглядаў, выразная ксэнафобія бюракрацыі, упорыстае ізаляваньне расейскага народу ад замежных кантактаў, таямнічасьць і зыгзакаватасьць дыпляматычнай практыкі, яўная няздольнасьць да зразуменьня чаго-небудзь у роўніцы заўсёды мірных, абапёртых на роўнасьці дачыненьняў між дзяржавамі, тэндэнцыя да ўважаньня ўсякіх мірных трактатаў за часовае перамір'е, тэндэнцыя да ўважаньня канфліктаў за рэч нармальную, а міру за зьявішча часовае й анармальнае». Ці-ж не бальшавізм гэта ў мініятуры яшчэ ў эпоху Вялікага Маскоўскага Княства?

Гэта толькі частка супольных рысаў між Вялікім Маскоўскім Княствам, першым зародкам расейскае імпэрыі, і сяньняшнім Савецкім Саюзам, якія добра пагледзіў Кэннан. Найважнейшай, аднак, і найбольш вызначальнай рысай, якая праходзіць чырвонай ніткай праз усю расейскую гісторыю й зьяўляецца найістатнейшым зьместам ейнага сяньняшняга бальшавіцкага этапу, зьяўляецца, побач з адзначанай Кэннанам «тэндэнцыяй да мэсыяністычнага разуменьня гістарычнай ролі Масквы», заўсёды агрэсыўны, непаўстрыманы, усьцяж жывы і дзейны расейскі імпэрыялізм. Гэтым і тлумачыцца, што Расея з маленькага маскоўскага княства шляхам бесьперапынных імпэрыялістычных заваяваньняў сяньня, побач із Задзіночанымі Штатамі Амэрыкі, сталася наймагутнейшай дзяржавай сьвету. Абазначаньне тэрытарыяльнае велічы яе, як аднае шостае часьці сьвету, сяньня сталася ўжо анахранізмам. Савецкі Саюз разам із сваімі сатэлітамі займае ўжо шмат большую тэрыторыю, а ягонай канчальнай мэтай, да дасягненьня якой пасьлядоўна імкнецца, зьяўляецца апанаваньне ўсяго сьвету.

Такім чынам бальшавізм, — пад гэтым паняцьцем мы разумеем расейскі камунізм — ня гледзячы на тое, што ў ім сканцэнтраваліся й многія інтэрнацыянальныя рысы, зьяўляецца ў сваей істоце ня чым іншым, як сучаснай, даведзенай да найвышэйшае ступені формай спрадвечнага расейскага імпэрыялізму й цэлага раду іншых нацыянальных асаблівасьцяў дарэвалюцыйнае Расеі. Таму ня можа сам сабой згінуць расейскі імпэрыялізм, як немагчыма, каб кола гісторыі павярнулася назад. Ён ёсьць зьявішчам сталым, пэрманэнтным, якое, як паказвае ўся гісторыя Расеі, усьцяж выказвае тэндэнцыю што раз далейшага насіленьня, а ніколі паслабленьня, тэндэнцыю наступу, а не адвароту. Такім, а ня іншым трэба яго разумець і ў залежнасьці ад гэтага павінна фармавацца ў дачыненьні да яго палітыка Захаду.

Пераважаючы яшчэ й сяньня пагляд на Захадзе, што з Савецкім Саюзам можна знайсьці супольную мову, сьмяротна мсьціцца на першым і ўзмацнае апошні

(Заканчэньне на 4-ай балоне)

ПРЫПАМІНАЕМ, ШТО ЎЖО ПАВІННА БЫЦЬ АДНОЎЛЕНАЯ ПАДПІСКА НА «БАЦЬКАЎШЧЫНУ» ЗА 1954 ГОД. ХТО ДА 1. I. 1954 ГОДУ НЕ АДНОВІЦЬ ПАДПІСКІ, ТАМУ ВЫСЫЛКА ГАЗЭТЫ БУДЗЕ АЎТАМАТЫЧНА СПЫНЕНАЯ.

Палітычныя Навіны

(3 — 9 СЬНЕЖАНЯ 1953)

Вынікі Бэрмудзкай канфэрэнцыі. 8 сьнежаня закончылася чатырохдзённая канфэрэнцыя прэзыдэнта ЗША Айзэнгаўэра, прэм'ера Вялікабрытаніі Чэрчыля і прэм'ера Францыі Ляніеля (апошні захварэў падчас канфэрэнцыі і яго заступаў міністар замежных справаў Францыі Бідо) на Бэрмудах, пасьля якой быў аовешчаны афіцыйны камунікат. У ім гаворыцца, што мілітарная сіла Захаду зьявілася перашкодай для новай агрэсіі і што канфэрэнцыя замацавала салідарнасьць заходніх дзяржаваў. Канфэрэнцыя сьцьвердзіла, што найвялікшай зарукай бясьпечнасьці зьяўляецца Атлянтычны пакт, які павінен быць далей разбудоўваны, як і павінна быць хутчэй зрэалізаваная эўрапэйская абаронная супольнасьць. Канфэрэнцыя ня вызнала дасюлешняга падзелу Эўропы і выказала надзею, што пры помачы мірных мерапрыемстваў краіны Ўсходняе Эўропы атрымаюць магчымасьць адыгрываць сваю ролю, як вольныя нацыі, у сям'і эўрапэйскіх народаў. Канфэрэнцыя выказалася за задзіночаньне Нямеччыны і ўрэгуляваньне пытаньня Аўстрыі, у сувязі з чым была прыгатаваная супольная нота Савецкаму Саюзу з прапановай скліканьня ў гэтай справе канфэрэнцыі чатырох міністраў замежных справаў у Бэрліне на 4 студзеня 1954 г. У справе далёкаўсходняй палітыкі канфэрэнцыя выказалася за хутчэйшае скліканьне палітычнай канфэрэнцыі ў справе Карэі і выказала прызнаньне Францыі й краінам Індакітаю ў іхным змаганьні супраць камуністычнай агрэсіі.

Прэзыдэнт Айзэнгаўэр супраць атамных збраеньняў. 8 сьнежаня прэзыдэнт Айзэнгаўэр сказаў перад Задзіночанымі Нацыямі прамову, у якой заклікаў народы спыніць перагонкі атамных збраеньняў і запрапанаваў стварэньне міжнароднай інстытуцыі пры Задзіночаных Нацыях, якая занялася-б пытаньнем мірнага выкарыстаньня атамнай энэргіі. Ён заклікаў Савецкі Саюз прыняць удзел у такой інстытуцыі. Прэзыдэнт ЗША, паклікаючыся на пастановы кангрэсу, прадставіў наступныя мэты Амэрыкі: 1. устанавіць сусьветную кантролю атамнае энэргіі дзеля выкарыстаньня яе для мірных патрэбаў, 2. распачаць зьмяншэньне запасаў атамнага аружжа, 3. давесьці людзкасьці, што вялікадзяржавы імкнуцца выкарыстаць атамную энэргію для мірных, а не ваенных мэтаў і 4. разьвязаць усе гэтыя праблемы на яўнай або тайнай канфэрэнцыі. Прэзыдэнт адцеміў, што сяньня маюць атамнае аружжа чатыры дзяржавы сьвету: ЗША, Вялікабрытанія, Канада і Савецкі Саюз.

Карэйская перадканфэрэнцыя зайшла ў сьляпы завулак. Камуністычная дэлегацыя на ўступнай канфэрэнцыі ў Панмунджоне адкінула новы праект ЗН, які упаўномачоным ЗН Дынам быў названы, як «апошні». Паводля гэтага праекту, палітычная канфэрэнцыя ў справе Карэі мусіла-б распачацца ў Жэнэве у тэрміне 4—6 тыдняў пасьля сканчэньня цяперашняй перадканфэрэнцыі. Апрача дзяржаваў, што бралі ўдзел у карэйскай вайне, на канфэрэнцыю былі-б запрошаныя «некаторыя або ўсе нэўтральныя дзяржавы», якія зацікаўленыя карэйскай праблемай, аднак бяз права голасу. Савецкі Саюз можа прыняць удзел у канфэрэнцыі на камуністычным баку, як ваюючая, а ня нэўтральная краіна. Камуністыя адкінулі гэты праект, дамагаючыся, каб Савецкі Саюз выступаў на ёй, як нэўтральная краіна. Упаўнамочаны ЗН Дын гразіў сарваньнем канфэрэнцыі, калі камуністыя ня пойдуць на ўступкі, аднак апошнім часам атрымаў ён ад міністра замежных справаў ЗША Дальлеса новыя інструкцыі прадпрыняць усё магчымае, каб давесьці да палітычнай карэйскай канфэрэнцыі.

Нямеччына вітае канфэрэнцыю чатырох. Пасьля таго, калі тры заходнія дзяржавы перадалі Савецкаму Саюзу ноту, што яны згаджаюцца на канфэрэнцыю ў справе Нямеччыны ў Бэрліне й запрапанавалі яе тэрмін на 4. 1. 1954 г., 10 сьнежаня заходнянямецкі парлямант энтузіястычна прывітаў гэты крок і выказаў сваё дамагаьне ад канфэрэнцыі. Усе дэпутаты парляманту ў гэты дзень усталі з сваіх месцаў і выказалі волю нямецкага народу да нацыянальнага й дзяржаўнага задзіночаньня Нямеччыны і ўключэньня яе, як раўнапраўнага сябры, у склад задзіночанай Эўропы.

Узнаўленьне дыпляматычных дачыненьняў між Вялікабрытаніяй і Пэрсіяй. На прапазыцыю пэрскага ўраду ўзноўленыя дыпляматычныя дачыненьні між Вялікабрытаніяй і Пэрсіяй. Супраць гэтага адбыліся ў Тэгэране 7 сьнежаня крывавыя дэманстрацыі, падчас якіх былі забітыя два студэнты. Звыш 30 дэманстрантаў было арыштаваных. Ранейшыя дыпляматычныя дачыненьні між гэтымі краінамі былі сарваныя пэрскім урадам у кастрычніку 1952 г. у сувязі з нафтавым канфліктам.

Адпружаньне ў справе Трысту. Італьянскі й югаславянскі ўрады дасягнулі 5 сьнежаня пагадненьне, паводля якога абодвы бакі вывядуць свае войскі з пагранічнай зоны Трыесту. У ночы з 5 на 6 сьнежаня абедзьве краіны пачалі ўжо свае войскі адтуль выводзіць.

ЗН дамагаюцца звароту ваеннапалонных з СССР. Задзіночаныя Нацыі станоўча зажадалі ад Савецкага Саюзу й ягоных сатэлітаў безадкладна выдаць усіх ваеннапалонных, абходзіцца зь імі згодна пастановаў аб правох чалавека і супрацоўнічаць у гэтай справе з камісіяй ЗН для ваеннапалонных. Сацыяльная камісія ЗН прыняла 44 галасамі супраць 5 савецкага блёку пастанову, згодна якой дамагаецца ад Задзіночаных Нацыяў выказаць «сур'ёзную руплівасьць» у тым, што вялікая часьць ваеннапалонных апошняй вайны яшчэ не вярнулася ў сваю бацькаўшчыну або лёс іх яшчэ ня выясьнены.

Данія супраць амэрыканскіх абаронных пунктаў. Данскі ўрад пастанавіў спыніць будову двух вялікіх амэрыканскіх абаронных пунктаў ў Ютляндыі. Гэта ёсьць першая азнака замежнага курсу новага сацыялістычнага ўраду Даніі, які не жадае сталага прабываньня амэрыканскіх лётніцкіх збройных сілаў на данскай тэрыторыі.

Разьвязаньне фінляндзкага парляманту. Фінскі прэзыдэнт Паасаківі разьвязаў цяперашні парлямант Фінляндыі і вызначыў новыя выбары на 7 сакавіка 1954 г.

Зьмяншэньне францускага ваеннага бюджэту. Францыя маніцца зьменшыць у 1954 бюджэтным годзе свой ваенны бюджэт з 1103 на 925 мільярдаў франкаў.

Пэкін абвінавачвае ЗША. У вадказ на дэбаты ЗН у справе камуністычных мордаў альянцкіх ваеннапалонных у Карэі Кітайская «Народная Рэспубліка» выступіла з контрабвінавачаньнямі Амэрыканцаў. У справаздачы Кітайскага Чырвонага Крыжа закідаюцца амэрыканскім збройным сілам жахлівыя зьдзекі над ваеннапалоннымі, якіх «цывілізаваныя людзі ня могуць сабе ўявіць». Пайменна, там гаворыцца, што ад студзеня да кастрычніка 1951 году 17.000 паўночнакарэйскіх і кітайскіх ваеннапалонных было забітых амэрыканскімі жаўнерамі.

УМОВЫ ПАДПІСКІ «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ» НА 1954 ГОД

Цана «Бацькаўшчыны» ў наступным 1954 годзе астаецца тая самая, што й дагэтуль. Для паасобных краінаў яна пададзеная на 1-ай балоне з правага боку загалоўку газэты.

Пры гэтым падаецца да ведама наступнае:

1. Падпішчыкі, што аплацяць падпіску за цэлы год згары, могуць на жаданьне атрымліваць газэту непасрэдна з Адміністрацыі, а не за пасярэдніцтвам Прадстаўніцтваў і Кальпартэраў.

2. У заакіянскія краіны газэта можа высылацца лётніцкай поштай толькі ў тым выпадку, калі лётніцкая падпіска за яе будзе аплачаная згары за цэлы год.

3. Падпішчык, які прыдбае пяць новых гадавых падпішчыкаў, будзе атрымліваць газэту цэлы год задарма.

Адміністрацыя «Бацькаўшчыны»

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

„Трагэдыя Расеі“

Нацыянальнае пытаньне ў СССР набрала дынамізму й перайшло з балонак эміграцкага друку розных нацыянальнасьцяў, насяляючых СССР, на балонкі друку шырокага сьвету. Гэтаму судзеілі ня толькі «сэпаратыстыя», але й абароньнікі «вялікай і недзялімай», расейскія антыбальшавікі. Ды іначай і быць не магло, — у пытаньні гэтым адлюстроўваюцца два кірункі сучаснага сьвету: дэмакрацыя і воля, у тым ліку, і ў першую чаргу, нацыянальная, як выхад з таго сьляпога завулка, куды завяла палітыка Расеі, як старой, гэтак і новай; ці антыдэмакрацыя, прыкрытая толькі хвальшывы лёзунгамі волі. Яго, гэтага хвальшу, з часоў сканчэньня другой сусьветнай вайны некаторыя народы, навет яшчэ не ўваходзячыя ў сфэру ўплыву СССР, пакаштавалі аж занадта. Апрача аддачы пад Саветы цэлага шэрагу сувэрэнных дзяржаваў, успомнім хаця-б тыя дрыжыкі, якія цяпер перажывае ўвесь сьвет. Гэта ўсё вынікі г. зв. «элястычнай», а ў сутнасьці апартуністычнай палітыкі ў дачыненьні да свайго пагрозьлівага «саюзьніка» — бальшавіка. Чаго толькі не рабілася, каб задобрыць яго і, думаецца, ня без нашэптваньня самых расейскіх «дэмакратаў»: **«перахварэе і цэлай застанецца»...** Абароньнікі гэтае палітыкі могуць запярэчыць: сытуацыя патрабавала, іншага выхаду ня было.

Прычына ня ў сытуацыі, бо яна ёсьць вынікам чалавечых падзеяў. Справа якраз у хвальшы, які быў заакцэптаваны яшчэ ў Мюнхэне. Замест таго, каб стаць на цьвёрдыя пазыцыі абароны волі й правоў чалавека перад усякімі ўзурпатарамі, вольны сьвет пайшоў на ўгоду зь імі. У першай фазе вайны вольны сьвет гэтую памылку намагаўся направіць, але ў другую фазу яму прыйшлося сыйсьці з гэтае дарогі і стаць у вабарону аднаго дыктатара перад другім. Такім чынам, зло ўвайшло каранямі ў жыцьцё і набрала моцы. Так заўсёды бывае, калі чалавек ня кіруецца шчырымі матывамі, а выходзіць з каньюнктуры. Як відаць, нельга падпісваць сяброўскіх умоваў «хоць з самым чортам», бо ён ніколі ня можа стацца анёлам. І сьвет цяпер стаіць у значна горшай сытуацыі, чымся перад вайной, а тым больш — перад Мюнхэнам. Расейскі імпэрыялізм, узьдзеўшы на сябе маску «вызвольніка народаў», пагражае захапіць ужо ўвесь сьвет. І толькі цяпер кіруючыя дзейнікі зразумелі гэта — хіба можа таксама яшчэ ня цалкам — і пачынаюць арганізаваць абарону.

У аспэкт гэтае справы ўключаецца — і няўхільна мусіць быць уключанае, — і гэтак знавае нацыянальнае пытаньне ў СССР, а гэтым самым і пытаньне нашае нацыянальнае волі. Праўда, ня ўсе, навет Расейцы, зразумелі гэта. Шмат хто навет зь вялікіх людзей падыходзіць да яго з сурдынкай — яшчэ ня зусім пераканаліся, што толькі абсалютная шчырасьць у дачыненьні да каштоўнасьцяў волі можа даць добрыя вынікі. Але навет і закасьцянелыя расейскія «адзінанедзялімцы» пачынаюць разумець: справа куды складанейшая, чымся гэта ім здавалася ўперад. Так, прыкладам, адзін з найбольш удумлівых расейскіх антыбальшавікоў, Р. Абрамовіч, у верасьнёўскім нумары «Сацыялістычнага Весьніка» піша: «Расея (СССР — М. Л.) мае вельмі малыя шансы застацца адзінай, цэлай дзяржавай... На пэрспэктыву распаду расейскай дзяржавы неабходна прызвычаіцца глядзець зь зімнай крывёй».

Але ў «Новым Рускім Слове» за 21 лістапада сёлета адзін з зацятых расейскіх «недзялімцаў» В. Літвінскі яму адказвае: «Зразумець лідэра расейскіх меншавікоў і ягонай Лігі ня цяжка. Для яго распад Расеі трагэдыяй не зьяўляецца»...

Па-першае, можа ўжо ў соты раз хочацца паўтарыць: што такое гэтая Расея? Такой дзяржавы на карце Эўропы да пачатку восемнаццатага стагодзьдзя ня было, аб чым і сам В. Літвінскі добра ведае. Затое былі: Ханства Татарскае каля Касьпійскага мора, вольны Вялікі Ноўгарад, Лівонія на месцы сучасных Эстоніі й Латвіі, Вялікае Княства Літоўскае на месцы сяньняшняй Беларусі, Летувы й часьці Ўкраіны, Кіеўская Русь на месцы цяперашняй Украіны, Крымскае Ханства, Бухара, Грузія, Армэнія, Туркестан і інш. Апрача гэтага існавала некалькі вольных незалежных княстваў расейскіх, як Разань, Цьвер. Сама Масква называлася Масковіяй. Было гэта княства замкнутае ў самым сабе, каля двухсот год падлягала татарскім ханам. Вызваліўшыся, яно прыняло дух і мэтады ўнукаў Чынгіс-Хана і працягвала агрэсыўныя войны ў дачыненьні да сваіх суседзяў. Некаторыя зь іх былі падбітыя лёгка, паколькі належылі да аднаго й таго этнічнага караня. Вялікае Княства Літоўскае (Беларусь), якое складалася з зусім іншых этнічных груп, мела апрычоныя традыцыі й культуру, жыло сваеасаблівым вольным жыцьцём, з практыкаваньнем Магдэбурскага права і з заходняэўрапэйскім ладам і культурнымі ўплывамі з Захаду, доўга не паддавалася, а навет вяло супраць Маскоўшчыны шматлікія пераможныя войны і гэтым самым доўгі час стрымлівала маскоўскую экспансію на захад.

Напасьледак і ягоная сіла была зламаная і яно, у канцы восемнаццатага стагодзьдзя, падпала пад панаваньне Масквы. Украіна была паняволена яшчэ раней. Разьвязаўшы рукі на Захадзе, Масква пачала ненасытную экспансію на ўсход і зьнішчыла Бухару, Грузію, Армэнію, Туркестан, Крымскае Ханства. І толькі ў канцы восемнаццатага стагодзьдзя ўзьнікла сягоньняшняя Расея або расейская імпэрыя. Дык дзе-ж тут трагэдыя Расеі, аб якой гаворыць В. Літвінскі? Трагэдыя, праўда, ёсьць, але толькі для тых народаў, якія былі заваяваныя й вынішчаныя ёю.

Расейскія дзеячы часта спасылаюцца на імпэрыялістычны век, у якім жыла й дзеіла Расея, і пры гэтым паказваюць на Ангельшчыну й Амэрыку, што і яны будавалі свае імпэрыі на імпэрыялізьме. Тут няма ніякага параўнаньня. Амэрыка й Ангельшчына падпарадкоўвалі сабе народы адсталыя, недаразьвітыя, але меўшыя й нявыкарыстоўваўшыя вялізарных багацьцяў. Пры гэтым, гэтыя дзьве ў сваёй каляніяльнай палітыцы ня толькі ня вынішчалі культуры й мовы каляніяльных народаў, але й намагаліся судзеіць іхнаму разьвіцьцю, а пазьней, як толькі пабачылі, што гэтыя народы дасьпелі да незалежнага дзяржаўнага жыцьця, давалі ім волю, прыкладам, Індыі, Бірме, Філіпінам і г. д. Расея-ж наадварот, будучы сама мала культурнай, заваёўвала краіны вольныя й культурныя і пасьля заваяваньня ня толькі не пакідала іхных культур, але і вынішчала іх. Вынішчала таксама й цэлыя народы, як, прыкладам, вольных Наўгародцаў за цара Івана Грознага. На тое ён і Грозны! — скажуць Расейцы, але хай яны назавуць хоць аднаго расейскага цара або іншага правадыра, якому ня былі-б уласьцівыя ў тэй ці іншай меры якасьці Грознага?!

Расея была і ёсьць цяпер жандармам Эўропы — вось у чым трагізм! А каб яна ім ня была, неабходна вызваліць з пад ейнага ўціску ўсе тыя народы, што яна некалі заваявала. Гэтага патрабуе ня толькі справядлівасьць, але й будучыня тых народаў, якія яшчэ да сяньня не апынуліся пад уладай Масквы, бо задаволіць апэтыт расейскага імпэрыялізму, як гэта паказала гісторыя, абсалютна немагчыма. Толькі тады, калі на ўсіх этнаграфічных нерасейскіх тэрыторыях паўстане цэлы рад вольных і незалежных народаў, шчэзьне спрадвечны расейскі імпэрыялізм, падобна як шчэз турэцкі імпэрыялізм, калі былі вызваленыя паняволеныя Турэччынай іншыя народы.

Р. Абрамовіч пэўны, што старая расейская імпэрыя канула ў вечнасьць. Зразумела, прызнацца ў гэтым яму было ня так лёгка. Але ён мусіў зрабіць гэткае асьветчаньне пад ціскам тых сілаў, што абудзіліся на былых тэрыторыях Расеі ў часы лютаўскай рэвалюцыі. Як запраўдны антыбальшавік, прагна жадаючы ўпадку бальшавізму, ён зразумеў і тое, што іграць на пачуцьцях вялікадзяржаўніцкага шавінізму унісон бальшавіком ня толькі шкодна, але й небясьпечна для справы антыбальшавіцкага змаганьня. Яму стала ясным, што для выратаваньня сьвету ад бальшавіцкай навалы неабходныя ахвяры, і першна-перш з боку самога расейскага народу, які ў гэтым няшчасьці больш за ўсіх вінаваты.

Надзеі на нутраную рэвалюцыю пасьля сьмерці Сталіна не апраўдаліся. Аб гэтым гаварыў і Р. Абрамовіч 17 кастрычніка сёлета на зачыненым сходзе расейскай сацыял-дэмакрацыі ў Нью Ёрку. Паводля справаздачы «Новага Рускага Слова» ён сказаў: «У вацэнцы ходу падзеяў, вызначаючых цяпер нутраную палітыку Савецкага Саюзу, зробленая памылка. Меркаваньне, што зьнікненьне Сталіна зь гістарычнае арэны зьявіцца санацыяй супраць хваробаў таталітарнага ладу, зь якога выходзіў шмат хто, у тым ліку й сам дакладчык, не апраўдаліся. Не апраўдаліся пошукі аналёгіі ў клясычных імпэрыях Аляксандра Македонскага, Чынгіс-Хана і Напалеона. Савецкія дыядохі, ханы і маршалы не пасварыліся між сабой і, відавочна, ня зьбіраюцца бурыць чырвонай імпэрыі, скаванай Сталінам. Ягоны адыход ад жыцьця не падмінаваў таталітарнай сыстэмы».

Гэта так! Але дзе гэтаму прычыны, што пошукі гэных аналёгіяў не апраўдаліся? Народ бясспрэчна пакутуе пад гэтай дыктатурай. Аб незадаваленьні сьветчаць хоць-бы тыя факты, што мільёны і мільёны арыштоўваюцца і вывозяцца ў Сібір. Пры чым сярод гэтых мільёнаў ня толькі простыя людзі, але і дыядохі, ханы і маршалы. Чаму-ж яны не пасварыліся? У СССР цяпер, таксама як і ўва ўсім сьвеце, ідэёвы тупы завулак, расчараваньне, апатыя да ўсяго. Абы пражыць дзень!

Ці магчымая ў СССР рэвалюцыя — зьнізу ці зьверху? Бясспрэчна — зьнізу бяз помачы верху немагчымая. Занадта прыціснуты народ. Зьверху магчымая, толькі трэба ведаць, чаго хоча народ. Тыя лёзунгі, на якіх была пабудаваная антыбальшавіцкая расейская прапаганда з заграніцы дагэтуль, выклікаюць у падсавецкага чалавека мала эмоцыі. Скампрамітаваныя перад народам асобы, як А. Керанскі, мусяць ад гэтае прапаганды адыйсьці, бо яны ў слухача, калі гаворыцца праз радыё, ня выклікаюць нічога болей, як толькі горкую ўсьмешку. Трэба знайсьці сьвежыя й захопліваючыя лёзунгі. Яны ёсьць: **нацыянальная свабода прыгнечаным на працягу вякоў народам і сацыяльная справядлівасьць.** Ні Беларусы, ні Украінцы, ні Грузіны ці Армяне ніколі не пагодзяцца з тым, што мільёны лепшых іхных сыноў зьнішчаныя ў расейска-савецкіх кацэтах у карысьць расейскага вялікадзяржаўніцкага імпэрыялізму. Усе апрычоныя народы, якія згубілі сваю незалежнасьць у сілу актаў расейскай агрэсіі — чырвонай ці белай — павінны стацца вольнымі бязь ніякіх перадумоваў. Гэты лёзунг настолькі дзейны, што ён можа ў вадзін нейкі мамэнт ускалыхнуць паняволеныя народы. Вось тады й пачнуць сварыцца ханы й дыядохі. Ні ў якім выпадку нельга праводзіць вялікадзяржаўніцкай расейскай прапаганды адсюль, з зарубежжа, якая толькі палохае цэлыя народы і таксама нічога не дае народу расейскаму. Цяжка бачыць што-небудзь небясьпечнае для ўсяго сьвету, а таксама й для самога расейскага народу, калі ён будзе ведаць праўду, што ў Расеі ніколі добрага ўраду ня было, і што ўсе існаваўшыя ўрады праводзілі палітыку імпэрыялізму ў дачыненьні да іншых народаў без карысьці для самога расейскага народу. Бальшавікі робяць гэтую прапаганду, каб як-небудзь утрымаць паняволеныя народы і ўтрымацца самым, і вельмі шкодна, што з заграніцы ім у гэтым памагаюць. **Прапаганда ёсьць толькі тады дзейная, калі яна прыносіць не палавіну, але ўсю праўду!**

Па-другое, да народаў трэба йсьці зь нечым канкрэтным, а ня з голымі схэмамі аб абстрактнай свабодзе. Такое канкрэтнае нясуць якраз толькі эміграцыі нерасейскіх народаў, бо эміграцыі гэтыя ўходзяць глыбака каранямі ў свае народы.

Так, трагічна! Але трагічна ад таго, як далёка засьлепленыя шавінізмам амаль усе бяз выключэньня расейскія эміграцыйныя партыі й арганізацыі, навет тыя, што называюць сябе дэмакратычнымі.

Марцін Люціч

Бэрмудзкая Канфэрэнцыя

(Заканчэньне з 1-ай балоны)

шае, становішча Францыі й ненаважанасьць Ангельшчыны. Пераканаўшыся, што ня ўдасца зрэалізаваць гэных плянаў у вадносна хуткім часе, трэба дагадвацца, што яны пастанавілі прысьпешыць канфэрэнцыю чатырох, вызначаючы ейны тэрмін на 4 студзеня. Не астаецца нічога іншага, як паказаць тым, хто яшчэ недастаткова пераканаўся ў няшчырасьці савецкіх палітычных ходаў, што ніякая канфэрэнцыя ня дасьць пажаданых рэзультатаў, калі ня супрацьставіць савецкім дамаганьням рэальнай сілы. Дзеля таго лепш, каб канфэрэнцыя адбылася як найхутчэй, каб ня траціць часу і хутка пасьля яе няўдачы прыступіць да рэалізацыі папярэдніх плянаў. Для нас зусім ясна, што чарговая канфэрэнцыя скончыцца дакладна тым, чым кончылася канфэрэнцыя ў Маскве ў 1947 годзе, г. зн. поўным фіяскам. Аднэй карысьці можна ад яе спадзявацца: аргумэнту для хісткіх палітыкаў Заходняй Эўропы. Гэтая канфэрэнцыя будзе яшчэ адным довадам, што палітыка Амэрыкі, палітыка канкрэтнай сілы зьяўляецца адзіна правільнай. Саветам у першую чаргу патрэбны час, каб паставіць на ногі атамную індустрыю, упарадкаваць нутраныя праблемы і ўсьпіць чуйнасьць дэмакратычнага сьвету, а ня чэснае шуканьне шляхоў да мірнага сужыцьця.

ПРАМОВА АЙЗЭНГАЎЭРА

Амаль адзіным пазытыўным мамэнтам у падзеях апошніх дзён зьяўляецца прамова прэзыдэнта Айзэнгаўэра перад Задзіночанымі Нацыямі. Яе можна лічыць адзінай маніфэстацыяй сілы й перасьцярогай для Саветаў перад іхнай агрэсіяй. Першы раз ад пачатку атамнай эры мы даведаліся аб магутных рэсурсах у Амэрыцы гэтага страшнага аружжа. Прэзыдэнт падчыркнуў вялікую небясьпеку атамнай вайны для чалавецтва і цывілізацыі дваццатага стагодзьдзя. Ён запрапанаваў кантролю над атамнай індустрыяй і эвэнтуальную яе забарону. Але наяўнасьць такой сілы ў руках Амэканцаў павінна змусіць Савецкі Саюз сур'ёзна прызадумацца ў сваім плянаваньні справакаваньня новае сусьветнае вайны.

Нам астаецца верыць у цьвёрдую й няўступлівую пазыцыю Амэрыкі ў дачыненьні да бальшавікоў. Той факт, што Амэрыка, як адзіная сіла, здольная супрацьставіцца бальшавіцкай загрозе, зразумела добра наяўнасьць гэнае загрозы, зьяўляецца асабліва пацяшаючым для паняволеных бальшавізмам народаў, у тым ліку й для нас Беларусаў.

С. Турцоў

ЛУКАШ КАЛЮГА 12)

Нядоля Заблоцкіх

ЧАСТКА ПЕРШАЯ
ПРЫГОДЫ Й ЛЯТУЦЕНЬНІ
(Працяг)

X

— Ціха, мужчыны! Паслухаем, што тут за рада, — супыніў крыху чаляднік свайго муляра, што разладэдзіўся быў з школьным вартаўніком, сеўшы на століках пярэдніх школьных лавак. Яны ўдвух — муляр з чаляднікам — правілі ў Хлюпскім «гарадзком» куравыя печы.

Вартаўніку ня цікавы былі настаўніцкія рады. Прыслухаліся яны яму. Пашоў ён за сваёю работаю, адных муляроў у клясе пакінуў. А тыя абадва сталі пад сьцяною. Утаілі дух. І чуюць яны з настаўніцкай інспэктараў, добра ім знаёмы голас:

— Панове настаўнікі!..

Далей зь яго гаворкі відаць было, што скончыліся ўжо ў гарадзкім акзамінты. Усе здалі — адзін толькі прыстава сын крыху мыляўся. З прыціскам гэта «крыху» інспэктар гаварыў.

— Ды й добра мыляўся, — аднекуль здалёк, зь нейкага кутка аказаўся настаўнік па геаграфіі й гісторыі.

За месяц, што прабылі тут, ня толькі ў твар, але й па голасе ведалі муляры настаўнікаў з гарадзкога, а чаляднік дык і вучняў апошняе клясы знаў усіх пятнаццаць. Любіў ён пакепкаваць зь іх, як дзе было з рукі.

— Панове настаўнікі!..

На добры лад, казаў інспэктар, усіх трэ' было-б выпусьціць. І прыставага сына гэтак сама, каб начальства з школаю ў злагадзе было, каб не задзіралася малечка што. Але, казаў, казна гэтага не дазваляе. Ёй не набрацца месца на пятнаццаць чалавек, а дзесяцём месца будзе і дзесяцёх трэба выпусьціць.

— Дык, уважаючы на гэта, нам давядзецца выбраць лепшых, вартнейшых, — скончыў інспэктар.

— Усім месца будзе, — ізноў чуваць было аднекуль здалёк, з кутка: — На пастухоў ёсьць вакансіі.

Далей інспэктар чытаў зь сьпісу прозьвішча і па адным перабіраў настаўнікаў:

— Слова мае... — па імя-бацьку называў іх.

На рэдкае рэшата прасявалі настаўнікі сваіх вучняў. Былі яны ў іх: адзін ціхі, другі паслухмяны, у ваднаго бацька добры чалавек, у другога — прыемны... Толькі настаўнік па геаграфіі й гісторыі ў вадно слова быў уляпіў на гэтым паседжаньні:

— Я згодзен з папярэднімі думкамі, — чуваць было з кутка.

Тады дайшлі і да Савосты Заблоцкага. Пра яго было першае слова настаўніка па расійскай мове.

— Кавалак мужыка, — сказаў ён.

Другому гаварыць давялося настаўніку па геаграфіі й гісторыі.

— На вакантнае месца — пастуху за падпасавіча? Так? Калі я вас зразумеў, Аляксандр Пятровіч, — папытаўся ён у настаўніка па расійскай мове ягонай папярэдняй думкі.

— Панове настаўнікі! Мы добрыя цераз лад. Вы-ж таго не забывайцеся, што нам зь пятнаццаці дзесяць выбраць трэба, — напамянуў інспэктар.

Усе па слову ськінулі настаўнікі пра Юстапчыка. І запісалі пра яго ў пратаколе, што з гарадзкога — вон! Савосту першаму на тым паседжаньні такі прыпаў лёс. Ды й іншых, што за ім у сьпісе былі, ужо на частае сіта пусьцілі: агледзіліся, што надта мяккія былі спачатку.

Тымчасам зьмяркалася. Школьны вартаўнік запаліў вялікую, панскую лямпу. Панёс настаўнікам. З калідору, як ён праходзіў паўз адчыненыя дзьверы, забег быў бляск у клясу, дзе падслухоўвалі муляры, ськінуўся на падлозе, марськануў па сьцяне.

— А ну іх! Трэба да Ёські ў мястэчка схадзіць, — сказаў муляр, агледзіўшыся, што ня рана.

— Ідзеце. А я паслухаю... Цікава — чым скончыцца.

І чаляднік астаўся. Дастоіў ён таго, што інспэктар сказаў:

— Паседжаньне ўважаю за зачыненае, — ды настаўнікі пачалі разыходзіцца.

Пад поўнач ужо бралася. Увесну гэта хутка: гадзіны дзьве, тры па зьмярканьні, дык і поўнач. Спаў, пэўне, ужо Савоста. Спаў і не спадзяваўся, што задасьць яму жалю і клопатных думак заўтрашні дзень. Не паглядзелі, ня ўважыліся на настаўніцкай радзе, што багатырскі ён сын. Дрэнь яшчэ яго бацька проці большых, мудрэйшых багатыроў, атопак зь іх нагі. Гэта толькі ў Баркаўцох, у бедных людзях багатыром ён чыніцца. А пастаў Юстапа з графамі, з князямі плеч-поплеч — які зь яго тады багатыр будзе?! Ня вучыліся ў Хлюпскім гарадзкім ні графскія, ні княжыцкія дзеці. Але вучыўся ў ім прыстава сын. І перавысіў такі чын усё Юстапава багацьце.

Назаўтрае — на дзіва яму! — муляраў чаляднік устаў зараней. Яны з мулярам людзі прыезныя. Дзе была работа, там і самі жылі.

Босы, бяз шапкі, з ручніком на левым плячуку, зьявіўся чаляднік на школьным ганку. Нёс конаўку вады, каб памыцца на дварэ. Невялічкі маразок кратаў чаляднікавы плечы. Паціскаў ён імі. Была пагодная, халаднаватая раніца. Недзе далёка ў полі за мястэчкам чырванела цяпер неба. Недзе — яшчэ далей — было сонца напагатове, каб не спазьніцца на тэрмін, каб якраз тады ўзыйсьці, калі па каляндарох зрабіць гэта трэба. Быў кірмашны дзень. Мялі вуліцы. Узадралі з бруку дробны пясок. Сівым, цяжкім пылам круціўся ён.

Раньнія і запыленыя зьбіраліся вучні.

— Што гэта на вас сну няма? — пытаецца ў іх чаляднік.

— Як наш акзамінт, цікава ведаць.

— Ёсьць чаго ўставаць ад поўначы?! Папыталіся-б у мяне — я-б вам і ўчора гэта сказаў.

— Адкуль-жа самі ведаеце?

— Адкуль ведаю?! Вываражыў-бы.

— Мы варагом ня верым.

— Як сабе знаеце. А я, каму ні варажыў, усім праўду казаў.

Быў пры гэтым прыстава сын.

— А ну, паваражэце мне. Паглядзім, — кажа — якая ваша праўда.

Азірнуўся на таварышаў, што яны на гэта скажуць? Маргнуў, што гэта ён так, адчэпнага, толькі прыклеп робіць, а не на праўду. Каб тыя скрывіліся ці як начай паказалі, што ім ня ў нос такія жарты, ён на сьмех зьвёў усё гэта. Зірнуў яшчэ прыстава сын і на вокны інспэктаравага дому: хаця-б адтуль ня ўбачылі гэтай варажбы. Ды па інспэктары сьмел быў прыстава сын: ніколі а гэтай пары не ўставаў той.

Паставіў чаляднік конаўку на шульцо, на плот уськінуў ручнік. Узяў прыставага сына руку. Буйныя, глыбокія і дробненькія — ледзь знаць, уежджаныя і ўтоптаныя дарогі, сьцежкі і ростані ўбачыў чаляднік на яе далоні. Заблудзіў, ня начай, пашоўшы па іх патрэбнага яму акзамінту шукаць. Доўга прыглядаўся, а нарэшце й кажа:

— Сьмел будзь: усё добра будзе.

Другому варажыў Савосту Заблоччыку. У гэтага лепшыя, выразьнейшыя дарогі. Хутчэй на іх дайшоў праўды муляраў чаляднік.

— Толькі ня крыўдуй. Я кажу, як праўда. І не чакай нават інспэктара — едзь дадому ды, калі сам ня ўмееш, папрасі бацькі, каб добрую, спусную дрытавіну зьвіў. Гэта будзе хлеб. А на гарадзкое — плюнь і нагою затры.

Спахмурнеў ад такой варажбы Юстапчык. Абвяла яго разгледжаная рука. Паморшчыліся, зьбегліся бліжай адна да аднэй усе нешчасьлівыя дарожкі на ёй.

— Я, братка, ня вінен — цешыў Савосту муляраў чаляднік. — Калі-ж так паказуе...

Роўна дзесяцём дакляраваў шчасьце знакаміты варажбіт, а пяцёх з пугаю на «вакантныя месцы» паслаў. І праўда.

— Ну як вы маглі ўгадаць? — пыталіся потым у чалядніка вучні.

— А што! А я не казаў: назавіцё мяне сабакам, калі я сваё слова на вецер пушчу?

Таго-ж самага дня надвечар прыяжджае Юстап па Савосту.

— Ну як? Ня здаў? — лепшага спадзяецца, але горшае на языку: такі наш баркаўскі чалавек.

— Ня здаў, — спакойна бацьку адказуе Савоста.

— Як то — ня здаў?! Ты мне праўду кажы.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Яшчэ аб нашай мове

(АДКАЗ ДР-У Я. СТАНКЕВІЧУ)

Прызнаюся — мне цяжка гаварыць пра артыкул др. Янкі Станкевіча, надрукаваны ў «Бацькаўшчыне» (№ 44 за 1953), як адказ на мае «Некалькі заўваг аб нашай мове» («Бацькаўшчына», № 1-2 за 1953): мала ў ім ёсьць таго, што адказвала-б даволі вядомай сэнтэнцыі — гавары пра ўсё, толькі гавары высока. І гэта не таму, што др. Я. Станкевіч амаль цалкам запярэчвае мае цьверджаньні — зусім не! Ёсьць нешта іншае ў артыкуле Я. Станкевіча, што я агульна назваў-бы залішняй самаўпэўненасьцяй. Я ўжо не гавару пра тыя мясьціны ў артыкуле, дзе дыскусыя аб мовазнаўстве зьнячуванай легкасьцяй даводзіцца да... абвінавачваньняў. Сп. др. Янка Станкевіч можа быць упэўненым, што на закіды такога характару я мог-бы адказаць па ўсіх правілах мастацтва, калі-б не маё шчырае жаданьне — ня ператвараць гутарак аб мове ў нешта асабістае.

Др. Янка Станкевіч вызначае мае «Некалькі заўваг», як надта агульныя, настолькі агульныя, што яму навет цяжка было заняць да іх якое-небудзь выразнае становішча. Праўда, гэта «паасобныя цьверджаньні аўтаравы» і заняць да іх зусім нядвузначнае становішча... Ды калі ўжо на тое пайшло, тыя больш чым скромныя мае «Заўвагі» носяць сапраўды агульны характар, безь якой колечы дакумэнтацыі, бязь імёнаў і цытатаў (зачапіць каго-небудзь у нас — значыць нажыць сабе ворага). Зрэшты, такая агульнасьць тлумачыцца яшчэ і тым, што пытаньні прынцыповага, праблематычнага характару заўсёды, як вядама, на столькі-ж агульныя, наколькі і канкрэтныя. Да тыкіх прынцыповых, мэтадалёгічных пытаньняў належыць пастаўленае ў маіх «Заўвагах» і пытаньне **адзінай літаратурнай мовы.** Я зазначаў, што і тут, на эміграцыі (я ўжо не гавару аб савецкай беларускай мове), мы нічога ці вельмі мала зрабілі ў кірунку ўнармаваньня нашай літаратурнай мовы, без чаго мы і надалей усё будзем сядзець у фальклёрнай стадыі. Час, нарэшце, нашаму мовазнаўству ўзьняцца ад эмпірызму да навуковага абагульненьня — дэструкцыйны этнаграфізм не заўсёды ў дружбе зь літаратурнай мовай. Зразумела, мовазнаўства, як такое, ня можа ўзяць на сябе абавязку стварэньня літаратурнай мовы — роля пісьменьніка тут куды больш значная і найбольш актыўная. Затое мовазнаўства павінна падказаць тэндэнцыю разьвіцьця мовы, **згодную зь яе духам.** Вось аб тэндэнцыях нашага мовазнаўства я і хацеў гаварыць у сваіх «Заўвагах». Іншая рэч — ці гэта мне ўдалося.

Да наибольш прыкметнай тэндэнцыі нашага мовазнаўства я залічаю тэндэнцыю **скраинага сэпаратызму** (дзеля Бога, прашу ня пераводзіць гэтага на мову палітыкі!). Практычна гэта тэндэнцыя выявілася ў няправільных дачыненьнях да некаторых ужо старых, традыцыйных (а без традыцыі, як я казаў, ня можа быць літаратурнай мовы) нормаў і замене іх новымі. Замена гэтая адбываецца за кошт правінцыяналізмаў і неалягізмаў. На першы пагляд — нічога надзвычайнага: такія шляхі вядомыя для кажнай літаратурнай мовы. Сапраўды ў гэтым нічога дрэннага ня было-б, калі-б гэта ня было самамэтай. Тут вельмі важным зьяўляецца пытаньне — наколькі ўспрыймальнай будзе такая нашая літаратурная мова, як эстэтычнае цэлае, ці будзе яна тым, што называюць стыхіяй, ці будзе яна нарэшце **з народу — і ў народ?** Мне ўсё-ж думаецца, што мовазнаўчая дзейнасьць па-за гэтым — ня мае ніякага сэнсу.

Шкадую, што др. Янка Станкевіч нічога не сказаў на гэту тэму — асноўную ў маім артыкуле, а прычапіўся да рэчаў пабочных і разгледзіў іх ня ў тым аспэкце, у якім я браў іх (зрэшты, такая доля можа спаткаць і гэтыя мае радкі). Маё (можа й няўдала выказанае) пажаданьне «большай экспансіі нашай мове, калі гутарка йдзе аб мове нашых вялікіх суседзяў», знайшло гнеўны адказ у Я. Станкевіча. У мяне гэта азначала, што мы не павінны зракацца пэўных словаў, **ужо бытуючых у нашай мове,** толькі дзеля таго, што яны, магчыма, агульнаславянскага паходжаньня і ёсьць, скажам, у расейскай, польскай, украінскай ці якой іншай мове. Напрыклад: **хлеб.** Няма ніякай патрэбы замяняць яго, для прыкладу, **емінай*)** толькі дзеля таго, што яно ёсьць ува ўсіх славянскіх мовах. Барбарызмам яно ў нас ня гучыць. Або: супраць, удзел, ліст, падкрэсьліць, частка і г. д. Нашто іх замяняць чысьцейшымі русыцызмамі: проці, учасьце, пісьмо, падчыркненьне (украінскае вымаўленьне тут не паможа), часьць (против, участие, письмо, подчеркивание, часть), калі яны ўжо сталіся нормай, традыцыяй? З другога боку — мы непатрэбна зракаемся часамі сваіх прыродных слоў толькі дзеля таго, што яны прысвоеныя суседнімі мовамі. Вось да ён працуе загадчыкам бальніцы. Ад ягонага імя прыняў узнагароду францускі чаго зводзілася мая «экспансія». Але з такой маёй тэзы др. Я. Станкевіч зрабіў выснаў, быццам я хачу... «каб Беларусы самі рабілі тое, што робяць нашай мове нашыя ворагі». Навуковая інтуіцыя др. Я. Станкевіча, відавочна, выявілася тут у нармальных для яго памерах.

М. Сяднёў

*) Паважанаму Аўтару артыкулу хочам напомніць, што слова **еміна** др. Я. Станкевіч ніколі ня ўжываў і ня ўжывае ў значэньні **хлеб,** але выключна ў значэньня **ежа.** — Рэд.

ДА НАШЫХ ПРАДСТАЎНІЦТВАЎ І КАЛЬПАРТЭРАЎ

Станоўча просім усіх нашых Прадстаўнікоў і Кальпартэраў ня высылаць наступнага падвойнага каляднага нумару «Бацькаўшчыны» ўсім тым, якія залягаюць з падпіскай. Гэны і наступныя нумары могуць быць высланыя адно тады тым падпішчыкам, калі яны разьлічацца з сваей задоўжанасьці. Гэтак сама й Адміністрацыя «Бацькаўшчыны» спыніць, уключна з калядным нумарам, высыльку такім самым падпішчыкам, якім яна высылае газэту непасрэдна.

Адміністрацыя «Бацькаўшчыны»

ВЫПІСВАЙЦЕ Й ПАШЫРАЙЦЕ БЕЛАРУСКІЯ КНІЖКІ ВЫДАВЕЦТВА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»!

Трыццаць год ад заснаваньня „Маладняка"

23 лістапада 1923 году ў Менску група маладых беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў у складзе Міхася Чарота, Андрэя Александровіча, Алеся Дудара, Язэпа Пушчы, Адама Бабарэкі й Анатоля Вольнага заснавала першую беларускую літаратурную арганізацыю пад назовам «Маладняк».

Гісторыя «Маладняка», як і гісторыя ўсяго беларускага літаратурнага руху пад саветамі, вельмі цікавая, але тым-жа часам і вельмі мала знаная нашаму сучаснаму эміграцыйнаму грамадзтву. Манячыся асьвятліць яе як мага шырэй у недалекай будучыні на гэтых-жа аслонах, тымчасам, у мамэнт юбілейнага ўспаміну, падаем толькі наиоольш агульныя и вызначальныя тычкі, якімі адзначыуся еины ажыўлены, а напару — дый у канцавым выніку — драматычны шлях.

З уводзінамі г. зв. «НЭП-у» ў Савецкім Саюзе настала вялікае, і пры тым што раз большае, ажыўленьне ў галіне культурнага жыцьця, выкліканае як часовым паслабленьнем партыйнага кантролю, гэтак і такім-жа часовым стымуляваньнем гэнага жыцьця тэй-жа бальшавіцкай партыяй, ня кажучы ўжо пра спрыяльныя матар'яльныя магчымасьці, што адчыніліся ў сувязі з самым эканамічным уздымам, беспасярэдня й вызначаным гэным «НЭП-ам». У сувязі з гэтым па ўсім СССР, і наиперш, ведама-ж, у самой Расеі — у Маскве, зьявіўся цэлы сьцяг новых выдавецтваў і пачалі выходзіць новыя, пераважна літаратурныя часапісы. Адным зь першых сярод іх, у красавіку 1922 году, пачаў выдавацца ў Маскве расейскі літаратурны часапіс моладзі пад назовам «Молодая Гвардия», кіраваны й фінансаваны самым ЦК камсамолу. Неўзабаве-ж пасьля выхаду ягонага першага нумару беларускія камсамольцы пачалі дамагацца ад таго-ж ЦК права й магчымасьці выдаваць падобны часапіс і на Беларусі пабеларуску. Нарэшце, увесну 1923 г. гэны ЦК дазволіў і ўзяўся фінансаваць гэты часапіс, накінуўшы гэтым у якасьці ягонага назову расейскае слова «Маладняк» (па нашаму было-б «Маладнік»), сэнс якога часткава перакладаў, а часткава парадыяваў-абніжаў назоў гэнага «цэнтральнага» маскоўскага воргану «Молодая Гвардия» («маладняк» ці «маладнік», як ведама, абазначае не «маладую гвардию» ваякаў, а маладую жывёлу, ці, у лепшым выпадку — маладую лясную расьціннасьць, у кажным разе — зьяву ня людзкога жыцьця, а заалёгічнага ці батанічнага...). Ужо гэтым устанаўлялася мяжа й дыстанцыя між масштабамі расейскага «цэнтру» й аканаванай на заўсёдную «асталасьць» пэрыфэрыі «нацыяналаў».

Тым ня менш, неразумна было-б ня выкарыстаць самай магчымасьці выданьня беларускага літаратурнага часапісу, і яна была выкарыстаная. За галоўнага рэдактара, таксама згары, быў прызначаны малады беларускі камуністы (дакладней — нацыянал-камуністы), паэта Міхась Чарот (М. Кудзелька). Выкарыстоўваючы-ж шыльду гэтага часапісу, група пералічаных напачатку маладых паэтаў і пісьменьнікаў угаварыла Чарота заснаваць пад гэтаю шыльдай першую беларускую літаратурную арганізацыю, што і удалося ў лістападзе 1923 году. Новая арганізацыя выявіла нябывалыя тэндэнцыі да росту, і неўзабаве налічвала ужо аж 500 (а паводля некаторых дадзеных — навет цэлую тысячу) сяброў.

Вялізарны рост «Маладняка» ня мог не затрывожыць бальшавікоў, і яны адразу-ж пачалі ўжываць усе захады дзеля апанаваньня арганізацыі й скіраваньня ейнае дзейнасьці на шлях камуністычнага культурніцтва й «палітасьветніцтва». Недалёказоркае нацыянал-камуністычнае кіраўніцтва «Маладняка» лёгка паддавалася гэтаму ціску згары, што й давяло ў 1926 годзе да расколу ў «Маладняку» й выхаду зь яго групы паэтаў і пісьменьнікаў (у тым ліку — двух зь ініцыятыўнае шасьцёркі заснавальнікаў — Адама Бабарэкі й Язэпа Пушчы), што заснавала ведамае й слаўнае «Узвышша». У 1927 годзе ад «Маладняка» адшчапаліся (у васноўным па тэй-жа лініі) яшчэ дзьве групы, што стварылі арганізацыі «Пробліск» і «Літаратурная Камуна» (група беларускіх футурыстых). У канцы 1927 году само нацыянал-камуністычнае кіраўніцтва «Маладняка» пакінула яго і разам зь некаторымі старэйшымі нацыянал-камуністычнымі, дый на той час камунізуючымі былымі нашаніўцамі заснавала новую літаратурную арганізацыю «Полымя». Чуючы, што лейцы кіраўніцтва літаратурнага руху высьлізгваюць з рук, бальшавікі пры памозе сваіх верных выканаўцаў — некаторых партыйцаў, што заставаліся ў «Маладняку», павялі ціск на складзеныя зь менш стойкага й больш маладога элемэнту арганізацыі «Пробліску» й «Камуны», дамагліся «самаліквідацыі» іх і звароту ў «Маладняк», які 28 лістапада 1928 году пераназвалі ў «Беларускую Асацыяцыю Пралетарскіх Пісьменьнікаў» (скарочана — «БелАПП») і ўлучылі ў «Усесаюзнае Задзіночаньне Асацыяцыяў Пралетарскіх Пісьменьнікаў» (у расейскім скароце — «ВОАПП»), падпарадкаваўшы цьвярдому «цэнтральнаму» маскоўскаму кіраўніцтву й афіцыйна абвесьціўшы новую арганізацыю «апораю партыі ў літаратуры». Гэтак, па пяцёх гадох, скончылася існаваньне «Маладняка». Аднак, і «БелАПП» нядоўга пережыў яго: у 1932 годзе і ён, і ўсе наагул літаратурныя арганізацыі па цэлым СССР былі зьліквідаваныя, і была заснаваная адзіная ўніфікаваная пісьменьніцкая ўстанова — «Саюз Савецкіх Пісьменьнікаў», што існуе й дагэтуль.

Адылі, ад 1930 году пачаліся на Беларусі масавыя «ліквідацыі» ня толькі арганізацыяў, але Беларусаў наагул, і першым чынам — беларускіх пісьменьнікаў. У выніку усіх гэтых «ліквідацыяў» на сяньня не засталося ня толькі нікога зь ініцыятыўнае групы «Маладняка», але й з усяе яго пяцьсотнае (ці нат тысячнае) армії захаваліся лічаныя адзінкі, зь якіх усяго чатыры (Лынькоў, Якімовіч, Зарыцкі, Куляшоў) не пакідалі «Маладняка», тры пакінулі яго ў 1926 годзе з «Узвышшам» (Крапіва, Глеока, Лужанін), а — Броўка — прайшоў праз стадыю «літаратурнай Камуны»... Усяго з 500 (ці тысячы) — 4, у лепшым выпадку 8 — вынік даволі красамоўны...

Гэтак у васнаўным выглядае вонкавая гісторыя «Маладняка». Можна яшчэ толькі дакінуць, што пад уплывам прыкладу «Маладняка» спрабавалі паўставаць падобныя арганізацыі і ў былой Заходняй Беларусі пад Польшчаю — «Веснаход» (між іншага, сам назоў — узяты ў Чарота ягоны паэтычны наватвор), пасьля — «Маладая Ускалось», але ні колькасна, ні якасна не дараўноўваліся яны «Маладняку» ды й не вытрымвалі хаця-б ягонага пяцьгадовага веку...

Успамінаючы сяньня дату заснаваньня «Маладняка», адзначаем яе тымчасам перадрукам вершу самога ягонага лідэра — старшыні арганізацыі і рэдактара часапісу — Міхася Чарота, вершу, які можна разглядаць як свайго роду «мотто», ці навет — гымн «Маладняка» (ня лішне пры гэтым задумацца над тым, чаму пад гэтым вершам паставіў Чарот дату **24 сакавіка,** пры гэтым выпісаўшы яе поўнасьцяй, чго не зрабіў ні пад адным зь іншых сваіх вершаў...

Міхась Чарот

МАЛАДНЯК

Тут учора бура была нам,
Вецер-чмут гайсаў з кута ў куток, —
Стары бор з карэньнем выламан,
Сумны шум яго навекі змоўк.

Заіскрыла сонца — вір агню...
Буралом спаліла з гольлямі...
Зьніклі хмары... і пад чырваньню
Ўсе прасторы сталі голымі.

А сягоньня чутны водгукі:
— Нам расьці — дык мала дня!
Толькі тут узьняцца мог такі
Волат лес — наш Маладняк.

Стройны лес і горды выглядам,
Быццам раць, што мкнецца ў бой.
Яго шум — што голас: «Выедам
Пастаяць за праўду галавой!»

Маладняк сваімі лісьцямі
Шапаціць нам казку — вольніцу...
Помнім, помнім, як калісьці мы
Чорных дзён стрымалі коньніцу.

Перастаў і сумны сьпеў гусьці,
Дні прайшлі — ажно ня верыцца!
Хто-ж адвагі знойдзе, сьмеласьці
З сілай моладзі памерацца?

24 сакавіка 1923 г.

— А так, што ня здаў.

Накрычаць, насварыцца на сына, спагнаць сваю бацькоўскую злосьць хацеў Юстап Заблоцкі, але зьбіў яго з трыбу Савоста сваім пагардлівым, змаўклівым абыходжаньнем.

— Ну зьбірайся-ж! — толькі сказаў, а на большае не адважыўся ён.

Хмурны, намружаны прывёз сына Юстап з навукі, але рада была Прузына.

— А я не казала?! От яно і спраўдзілася. Дармо, Савостачка! Ня здаў — і чорт яго бяры! Дзяды, прадзеды твае акзамінтаў ня зналі і здаровы, вясёлы былі.

Маўчаў, гатовага слухаў Юстап Заблоцкі. Але:

— Шчэ паглядзім. Можа што й здумаем, — нарэшце сказаў.

Таварыш чытач!

Давядзецца нам прыпыніцца хвілін на колькі. У нашым баку — ня ведаю як дзе, а ў Баркаўцох так — прыдзе чалавек у хату, цікавую навіну прынясе расказаць, але загаворыцца ды й забудзецца пра яе.

— Ах, няма часу! — скажа. — Трэба йсьці.

— Пабудзь, пагуляй, — ёсьць такі звычай прасіць чалавека — патрэбен ён тут ці не.

— О, не! Дзе вы бачылі!? Трэба йсьці.

Стане ў парозе чалавек, возьмецца за клямку. Дагаваруе сваю распачатую мову.

— А вы чулі, што... — тое й тое: успомніць ён сваю забытую навіну, як возьмецца за клямку.

Загаворыцца дый аб дом забудзецца чалавек. Пусьціць клямку з рук, з парогу далей на хату адыйдзецца. Так і так яно было... Аж пакуль ня ўся навіна, аж пакуль ня нойдзе на памяць:

— Трэба йсьці.

— Пагуляй. Пасьпешышся з домам...

— Не. Трэба йсьці. І так доўга забавіўся.

Ды бывае, што і на гэтым не канец. Бывае разоў трэйчы будзе за клямку брацца багаты на навіны чалавек.

Возьмемся і мы з вамі за клямку, таварыш чытач, каб прыклеп быў пачаць мову пра забытага намі Клемку Філончыка, што 'маль ні да прызыву ў Баркаўскую пачатковую школу хадзіў, але сяк-так, такі, скончыў (паўздужаў) яе.

Наважыў Язук з свайго Клемкі чалавека зрабіць. Проста бяда была зь ім: хоць ты кол на галаве чашы ўпартаму. А яшчэ пашанцавала: хлопца ў войска ня ўзялі, што адзін сын быў ён у бацькі. Перабыў Клемка прызыў дый вярнуўся дадому.

Крыўда была Язуку. Славіўся ён багатыром у Баркаўцох ня меншым за Заблоцкага. У таго толькі нівы шырокія ды сядзіба заможны выгляд мае. Язукоў-жа й двор вузкі й зямлі ў Баркаўцох у яго ня лішняе, але за тры вярсты на засьценку ён мае прыкуплены чатыры дзесяціны.

Завялік Язукоў Клемка на навуку. Па гадох яго ў гарадзкое ўжо ня прымуць.І Філончык свайму службы праз людзі прапытаваўся: абы дома ня быў, абы трохі каля паноў цёрся. Усіх пісароў, усё дробнае — прыступнае простаму чалавеку — начальства ападаў ён, стараючыся сыну лёгкага, панскага хлеба.

Потым аднаго разу ў жніво па сьняданьні кажа Язук:

— Зьбірайся, Клемка. Паедзем.

Запрэглі яны свайго дэраша ў каламажку на жалезным хаду. Падыспад у сядзеньне ўкінулі пшэннай пытляванай мукі паўтраця пуда. Наверх кучак чатыры ўськінулі канюшыны дэрашу даць, калі дзе забавяцца.

— Садзіся, Клемка.

Ня меў Юстап каламажкі на жалезным хаду. Знарок прысмаліў дэраша Язук, як пад'яжджалі пад Заблоцкіх, каб лякаталі колы.

А за вёскаю жалі жанкі жыта пры дарозе.

— Памажы Божа! — даў ім Язук.

— Дзінькуе. Куды гэта вы? Сягоньня-ж ня кірмашны дзень.

— Дармо.

Далей праехалі. Ізноў блізка жнеі. Ізноў давялося:

— Памажы Божа! — даваць.

— Куды вы гэтак зараней?! — ізноў пытаюць.

— Далёка, — кажа Язук.

— Ты-ж глядзі: чалавекам будзь, — едучы навучаў ён сына. — Не чакай, каб табе хто перапусьціў — хай лепш тваё пяройдзе.

— Ць-сь-ся!.. сутрымаў Язук дэраша перад поштаю, пры самай скрынцы, за шчакеты яго прывязаў, адпусьціў пасак, падкінуў кучку канюшыны. Доўга ён меўся забавіцца тут.

— Дзень добры панству! — на кухню зь мяшэчкам зайшоўшы, наймічцы кажа Язук. Ськінуў шапку і на Клемку крывіцца, каб той гэтак сама зрабіў.

— Сядайце. А я пайду пану скажу. — Сьцерла анучаю ім зэдлік наймічка.

— Дармо... Пастаім... Сядзелі ўсю дарогу.

Адны, бацька з сынам, у кухні асталіся.

— Толькі будзь чалавекам: каб мне за цябе брыдка ня было, — Клемка Філончык — сам сабе хлопец — чуе ад бацькі.

З Махоўскім, начальнікам пошты, што з сваіх пакояў прышоў сюды, на кухню, мала было гаворкі. Ужо быў у яго Язук, гаварыў пра Клемку і ён казаў:

— Прывозь — будзем бачыць.

— От можа-б, пане, ім, — на мяшок і Клемку паказуе Філончык — далі які прытон.

Разьвязаў мяшок начальнік пошты. У пальцах пацёр муку — мяккая. На руку ўзяў, паглядзеў — белая, добрая.

— Высып у балейку, — наймічцы загадаў.

— А куды яго? — пра Клемку пытаецца Язук.

— Хай астаецца. Толькі на сваім хлебе. Пакуль наложыцца... А там — будзем бачыць.

— А як, пане, з кватэраю будзе?

— Кухня прасторная...

— От, дай Божа вам здароўя.

— Пашыўся ў паны Язучок, — сказалі ў Баркаўцох, як убачылі старога Філончыка аднаго едучы дадому.

І з твару і з натуры адмяніўся Язучок, у Хлюпску пабыўшы. На другое лета, як прыехаў вялікадняваць да бацькі, па веніку вусы прывёз — такія доўгія і пушныя яны ў яго. Калі пра што распытваліся, гаварыў мала — больш слухаў ды:

— Ну ізьвесна, — казаў.

За навіну былі яму яшчэ тыя вусы і Клемка ўсё губы аддзімаў, нашатываў іх.

Цяпер няма такога звычаю, а даўней запасавалі каровы. Даўней людзі адны адных баяліся: каб не ўраклі жывёлу, каб благія ёй вочы не пашкодзілі, каб не зьбягалася млека, усьлед ня кісла, як толькі падоіш карову. Першы дзень кажан сам свой набытак у поле гнаў. І варагоў і каб жывёла адна адну не папрасаджавала, глядзелі: разбаронявалі, калі тыя возьмуцца пароцца.

Пакуль гнаць у поле, зрабіла Язучыха так, як даўней усе людзі рабілі: наліла ў дайніцу сьвянцонай вады, зьвязала мяцёлку з акалотных каласоў, каб пакрапіць набытак. На дварэ ўжо:

— Сю-поле... Сю-поле... — як песьню, голасам цягнуў Язук.

Выгнаў ён «Чарну» і «Рыжу», а «Рабы» не чапаў.

— Хай яшчэ тыдзень які ў хляве пастаіць. Будзем у поле пушчаць, як цялё адсадзім, — пра «Рабу» яшчэ ў хаце казаў ён Язучысе.

Быў дзень людзям на дзіва.

Вышаў Клемка на ганак. Стаў, пастаяў, паглядзеў, а тады дастае зь кішэні футарал. З таго футарала сінія, нязнаныя ў Баркаўцох, акуляры дастае. Чапляе іх на нязвыклы нос, закладае драты за вушы.

Несла Язучыха сваю дайніцу з крапідлам. Заўнялася. Пазірае на сына, а сын праз свае сінія куплёныя вочы на бацькаў набытак.

— Эта что за зьвяры такія? — пытаецца сын у мацеры.

Пастаўляла тая на яго вочы.

— Што табе?.. Ці ні прыступіла што? Году няма, як з дому і ўжо свая карова зьверам падалася. Да там-жа, у тваім Хлюпску, рана-вечар пастушкі гэтага «зьвера», як ты кажаш, на павадкох з пашы на пашу водзяць.

Дастаў Клемка драты з-за вушэй. Прыняў ад ачэй сіняе шкло. Кажа:

— Чорт яго ўсё ў галаве дзяржаць будзет. За гэта ўрэмя мы окала мудрэйшых вяшчэй аціраліся.

Злажыў і назад у футарал палажыў свае куплёныя вочы. І ад тых дат скрозь зямель пашлі яны. Першы і апошні раз людзкавалiся на Клемкавым носе.

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Хвалышывае разуменьне бальшавізму

(Заканчэньне з 1-ай балоны)

ды заахвочвае яго да далейшае экспансіі. Такі пагляд псыхалягічна раззбройвае заходнія грамадзянствы і адварочвае іхную ўвагу ад пагражаючае яму небясьпекі. Досыць сяньня прагледзіць высказваньні адарваных ад канкрэтных зьяваў жыцьця заходніх інтэлектуалістых, каб пераканацца, што сваімі фантастычнымі тэорыямі аб бальшавізьме яны прыносяць Захаду ня меншую шкоду, чымся дэструкцыйнае дзеяньне камуністычных пятых калёнаў. У іх мы знойдзем такія недарэчнасьці, як пераконваньні, што тое, што мы ўважаем за праявы савецкай агрэсіі, зьяўляецца толькі актам самаабароны перад страхам агрэсіі з боку Захаду, як пагляд, што савецкі камунізм выказвае тэндэнцыю да эвалюцыі ў кірунку дэмакратызму, як тое, што бальшавізм сам у сабе ня ёсьць злом, а ягонае зло выплывае зь перамаганьняў часовых цяжкасьцяў, нармальных і зразумелых у працэсе ўсякіх вялікіх пераваротаў і рэформаў, і цэлы рад падобных абсурдаў. Усё гэта ўсоньвае чуйнасьць заходняга сьвету й засланяе перад ім рэальную небясьпеку. А гэтая неоясьпека зьяўляецца вялізарная.

Сяньняшняя эпоха зьяўляецца найвялікшай перагонкай зораеньняў, якой ня ведала ніколі гісторыя. Рымскі прынцып si vis pacem, para bellum (калі хочаш міру, прыгатаўляйся да вайны) ніколі ня меў такога шырокага прытарнаваньня, як сяньня. Захад уважае, што каб паўстрымаць Савецкі Саюз ад вайны і заясьпечыць мір, трэба самому зброіцца й мець мілітарную над ім перавагу. Гэта правільна, але толькі на бліжэйшую мэту. Такая палітыка магла-б апраўдаць сябе тады, калі-б савецкі імпэрыялізм быў зьявішчам толькі пераходным і часовым. Але паколькі ён ёсьць, як мы ўжо зазначылі, зьявішчам бесьперапынным, тады такая палітыка ня мае пад сабою моцнага грунту. Бо ці-ж без канца можа трываць гэтая шалёная перагонка збраеньняў і збройнай гатоўнасьці? Мусіць-жа наступіць мамэнт, калі сьвет эканамічна й псыхалягічна заломіцца. Пры гэтым нельга забывацца, што Саветы маюць большыя шансы перетрываць Захад у гэтай гарачцы. У той час, калі Захад мусіць лічыцца з жыцьцёвым стандартам свайго насельніцтва, Саветы, дзе панує таталітарная сыстэма прымусу, рабіць гэтага не патрабуюць. Да гэтага трэба дадаць, што Саветы могуць карыстацца сыстэмай нявольніцкай працы ў такіх калясальных разьмерах, у якіх толькі захочаць.

Калі стаць на становішчы, што агрэсыўная палітыка Саветаў сама сабой ня спыніцца, — а на іншым становішчы стаць нельга — і што бальшавізм, як форма расейскага імпэрыялізму, зьяўляецца не часовым, але сталым зьявішчам, лёгічна астаецца адзін толькі выхад: зьнішчыць яго сілай, зьнішчыць само жарало гэтага імпэрыялізму, якім зьяўляецца ў тэй ці іншай форме, пад тым ці іншым назовам расейская імпэрыя. Такое разьважаньне можа, аднак, мець характар толькі тэарэтычнай спэкуляцыі, бо-ж ведама, што Захад прэвэнцыйнай, зачэпнай вайны супраць Савецкага Саюзу не распачне. Прэвэнцыйная, г. зн. папераджальная вайна з боку Захаду зьяўляецца немагчымай з трох наступных прычынаў: 1. само паняцьце прэвэнцыйнай вайны зьяўляецца супярэчным з маральнымі догмамі Захаду. 2. Дэмакратычны лад ёсьць наагул няздольным да распачацьця прэвэнцыйнай вайны. Калі-б, прыкладам, урады заходніх дзяржаваў і найбольш прадбачлівыя палітыкі і ўважалі, што адзіным выхадам з сытуацыі зьяўляецца прэвэнцыйная вайна, распачатая ў найбольш спрыяльны для іх мамэнт, дык урады гэтыя мусяць заўсёды лічыцца з настроямі свайго насельніцтва. А, як ведама, шырокія масы, якія ў першую чаргу нясуць на сваіх плячах цяжар усякай вайны, ніколі яе ня хочаць. 3. Калі яшчэ нядаўна прэвэнцыйная вайна была для Захаду тэарэтычна магчымай, дык такая эвэнтуальнасьць сяньня ўжо поўнасьцю адпадае, калі стала ведамым, што і Саветы прыгатавалі вадародную бомбу. З мамэнтам вынаходу й выпрабаваньня Саветамі вадароднай бомбы мілітарная перавага Захаду фактычна больш ня існуе.

А тымчасам для заходніх дзяржаўных мужоў і палітыкаў не зьяўляецца ніякім сакрэтам, што Савецкі Саюз, калі-б меў пэўнасьць перамогі, ужо даўно распачаў-бы вайну супраць Захаду і што распачне яе заўсёды ў такі мамэнт, калі ўпэўненасьць гэтую будзе мець. Уся трагэдыя ў тым, што, ня гледзячы на сьвядомасьць гэтага, Захад яшчэ дагэтуль не патрапіў здабыцца на палітычнае супрацьдзеяньне, каб сябе палітычна й псыхалягічна ўзмоцніць, а Савецкі Саюз аслабіць. Сярод заходніх палітыкаў заўважаецца сяньня дэзарыентацыя й разгубленасьць. Многа гаворыцца аб патрэбах такога супрацьдзеяньня, але яно, паза мілітарным збраеньнем, якое мае выключна абаронны характар, далей амаль ня выходзіць. Гэтае палітычнае супрацьдзеяньне Захаду, на нашую думку, павінна было-б разьвівацца ў трох галінах.

Па-першае, у вабліччы рэальнай небясьпекі савецкай агрэсіі й няўхільнасьці генэральнай ваеннай расправы з Савецкім Саюзам, Захад павінен скансалідавацца палітычна, каб быць у стане мабілізацыйнай гатоўнасьці. Тымчасам палітычныя супярэчнасьці між заходнімі дзяржавамі, умела падбухторваньня й выкарыстоўваныя Саветамі, бяруць верх над сьвядомасьцю запраўднае небясьпекі. Найбольш вымоўным гэтага прыкладам можа быць тварэньне эўрапэйскай абароннай супольнасьці, якая, пасьля нязьлічоных нарадаў, перагавораў і канфэрэнцыяў, ужо трэйці год, як ня можа стацца дакананым фактам, і вялікае пытаньне, калі ім, напасьледак, станецца.

Па-другое, павінна наступіць усьведамленьне заходніх грамадзянстваў аб запраўднай камуністычнай небясьпецы, якая яму загражае. А дзеля гэтага неабходна ня ўсоньваць ягонае чуйнасьці ўсякімі несамавітымі й шкоднымі тэорыямі аб расейскім бальшавізьме і камунізьме наагул, а трэба яму паказаць гэтае зло такім, якім яно ёсьць у запраўднасьці. А тымчасам заходнія палітыкі дзеля сваіх дробных каньюнктуральных мэтаў, каб не дражніць Крэмля, вельмі часта гэтае ягонае зло перад сваім грамадзянствам хаваюць і тым самым у ягоных вачох абяляюць бальшавізм. У той час, калі бальшавікі ў мэтах ачарненьня Захаду паслугоўваюцца навет найбольш подлым хвальшам, як абвінавачваньне Амэрыкі, што яна вяла ў Карэі бактэрыялягічную вайну, Захад часта ў сваей антыбальшавіцкай прапагандзе ня хоча выкарыстоўваць фактаў праўдзівых, якія найбольш кампрамітуюць Савецкі Саюз. У свой час дасьледваная камісіяй амэрыканскага кангрэсу справа катынскіх забойстваў так і не знайшлася на парадку дзенным Задзіночаных Нацыяў. А ўжо даўно ведамая на Захадзе справа такіх-жа катыняў у Карэі, як і даўно дасьледжанае камісіяй ЗН пытаньне прымусовай працы ў Савецкім Саюзе толькі апошнімі днямі былі разгляданыя на пленарным паседжаньні ЗН. Антысавецкая і антыкамуністычная прапаганда, якая магла-б мабілізаваць супраць бальшавізму народныя масы, вядзецца няўдала, нясыстэматычна і недастаткова.

Па-трэйцяе, неабходнай перадумовай дзеля падтрымліваньня рэвалюцыйных настрояў сярод народаў Савецкага Саюзу зьяўляецца адпаведна ведзеная супраць яго палітычная й псыхалягічная афэнзыва. Тымчасам гэтая афэнзыва часта пераходзіць у капітулянцтва, у найлепшым выпадку Захад знаходзіцца ў стане палітычнае й псыхалягічнае абароны, а ня наступу. І гэта зьяўляецца найбольш недаравальнай памылкай заходняе палітыкі, згубныя вынікі якой у будучыні могуць быць трагічнымі. Захад або зусім ня выкарыстоўвае ў сваей прапагандзе й палітыцы або выкарыстоўвае ў вельмі недастатковай ступені тых слабых месцаў, што зьяўляюцца ўзапраўды Ахілесавай пятой Савецкага Саюзу. Гэтым слабым месцам прысьвяцім адзін з наступных нашых артыкулаў, тут толькі адцемім, што Масква нічога так не баіцца, як такой заходняй палітыкі, якая ўсім сваім астрыём была-б накіраваная на тыя ейныя нутраныя й вонкавыя дачыненьні, якія прадстаўляюць для яе запраўдную загрозу.

Гэтак зь няправільнага, павярхоўнага і ўпрошчанага разуменьня істоты бальшавізму й закрываньня вачэй на вялізарную ягоную небясьпеку для вольнага сьвету выплывае недацэньваньне патрэбы адпаведнага змаганьня з апошнім.

Язэп Каранеўскі

Перадача узнагародаў Нобля

У аўлі ўнівэрсытэту ў Ослё адбылася ў чацьвер 10 сьнежаня 1953 г. ўрачыстая перадача мірных узнагародаў Нобля за 1952 і 1953 год. Ляўрэатамі высокае ўзнагароды зьяўляюцца эльзаскі філязоф культуры й лекар Альбэрт Швайцэр і былы амэрыканскі міністар замежных справаў генэрал Жорж Маршаль, які асабіста прыбыў у Ослё. Швайцэр мусіў аднак астацца ў заходняй Афрыцы, дзе ён працуе заладчыкам Бальніцы. Ад ягонага імя прыняў узнагароду францускі пасол у Швэцыі. Швайцэр у сваім пісьме асьветчыў, што атрыманую ім узнагароду ў вышыні 172.000 швэдзкіх каронаў (140.000 нямецкіх марак) ён поўнасьцю прызначыць на разбудову сваей бальніцы, дзякуючы чаму зможа прыняць у яе яшчэ 250 хворых.

Падчас перадачы ўзнагароды Маршалю дайшло да прыкрых выпадкаў. Калі прэзыдэнт нарвэскага Камітэту Нобляўскіх Узнагародаў узыйшоў на подыюм, каб адчытаць дыплём аб узнагародзе, быў ён перапынены крыкамі камуністычных дэманстрантаў з галерыі. Пераважна маладыя камуністыя крычалі: «Ён ня ёсьць мірным кандыдатам» і «Маршаль, вяртайся дамоў». Адначасна пасыпаўся на прысутных, сярод якіх знаходзіўся нарвэскі кароль Гаакон, дождж лятучак, у якіх абвінавачваўся Маршаль за спушчэньне атамных бомбаў на Гірашыму й Нагасакі. Галерыя была хутка ачышчаная нарвэскай паліцыяй, пасьля чаго прэзыдэнт нарвэскай ніжняй палаты Гамбро асьветчыў, што для міру ў Эўропе нічога ня было больш выдатным, як арганізацыя ляўрэатам пляну Маршаля.

У гэты-ж самы час у Штокгольме швэдзкі кароль Густаў Адольф даканаў акту раздачы ўзнагародаў Нобля для прадстаўнікоў фізыкі, хіміі, мэдыцыны й літаратуры. Узнагароду для хіміі, залаты мэдаль, дыплём і 140.000 ням. марак, атрымаў дваццаты ўжо Немец з Фрайбургу хімік праф. Гэрман Штаўдынгэр за свае заслугі ў галіне вынаходніцтва штучных матарыялаў. Узнагароду для мэдыцыны атрымалі два, у Нямеччыне народжаныя, а сяньня пражываючыя ў Вялікабрытаніі й ЗША, прафэсары Ганс Адольф Крэбс і Фрыц Альбэрт Ліпман, а ўзнагароду для фізыкі атрымаў галяндзкі вучоны праф. Фрыц Цэрнікэ. Узнагароду для літаратуры перадаў кароль Густаў Адольф на рукі спадарыні Чэрчыль для ейнага мужа сэр Вінстона Чэрчыля, які ня мог прыбыць асабіста, знаходзячыся ў гэты час на Бэрмудзкай канфэрэнцыі. Узнагарода Чэрчылю была прызнаная за ягоныя ўспаміны з апошняй сусьветнай вайны.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ КАТАЛІКОЎ У БЭЛЬГІІ

Буду адпраўляць Божу Службу для Беларусаў у наступных мясцовасьцях:

1. 13. 12. 1953 а 11-ай гадзіне ў Menlenberg.
2. 20. 12. 1953 а 9-ай гадзіне ў Charleroi ў украінскай капліцы каля Hotel de Ville.
3. 25. 12. 1953 а 10,30 гадз. у Flemalle Grande (Liege) ў капліцы пры школе недалёка ад касьцёла.
4. 27. 12. 1953 а 11-ай гадз. ў Harchies ў касьцеле каля (Mons).

а. Фр. Чарнаўскі

ШУКАЮЦЬ

Брата Кіраенку Васіля, нар. 1920 г., зь вёскі Плаўнік Чашніцкага раёну, які служыў на пачатку вайны ў чырвонай арміі, шукае брат Іван. Весткі слаць на адрас:

Mr. I. Kirajenko, Rue Ferd. Nicolay 81/2 Seraing s/M. Belgique.

*

Адама Таранду зь мястэчка Ляхавічы Баранавіцкай акругі, які праўдападобна знаходзіцца ў Канадзе, шукае Пятрусь Шкляньнік. Весткі слаць на Прадстаўніцтва «Бацькаўшчыны» ў ЗША.

*

Міхася Вінаграда зь Лізараўшчыны Гарадзіскага раёну, які апошнім часам (1944 г.) быў у Мюльгаўзэне (Эльзас) — шукае Міхась Гасьціла. Весткі слаць на адрас: Mr. Michaś Hascila, Box 129, Snow Lake, Manitoba. Canada.

Водгукі Слуцкай гадавіны

БУЭНОС АЙРЭС (АРГЕНТЫНА):

Аддзелам Беларускіх Камбатантаў пры Згуртуваньні Беларусаў у Аргентыне быў ладжаны ў Буэнос Айрэс урачысты акт, прысьвечаны Слуцкаму Паўстаньню. Урачыстасьць пачалася паніхідаю за паўшых у Слуцкім Паўстаньні і наагул за вызваленьне Бацькаўшчыны, якую адслужыў протапрасьвітар Б. Арыйчук, сьвятар УАПЦ, які мае апеку над праваслаўнымі сябрамі ЗБА.

Наступным пунктам быў даклад сп. Ул. Другаўца, які, хоць коратка, але зьмястоўна прадставіў падзеі таго часу.

Далей сп. К. Мерляк, як асабіста знаёмы сьв. пам. інж. Л. Рыдлеўскага, удзельніка Слуцкага Паўстаньня, паведаміў прысутных аб ягонай перадчаснай сьмерці і расказаў пра ягоную палітычную й грамадзкую дзейнасьць, якую сьв. пам. Л. Рыдлеўскі праводзіў на працягу ўсяго свайго жыцьця.

Урачыстасьць закончылася аднэй мінутай цішыні і прасьпяваньнем беларускага нацыянальнага гымну.

К. Мацкевіч

МАНЧЭСТАР (АНГЕЛЬШЧЫНА):

Беларусы гораду Манчэстар і яго аколіц урачыста ўшанавалі 33-юю гадавіну Слуцкага Паўстаньня 29 лістапада сёлета ў Беларускім Клюбе. Урачыстасьць была зарганізаваная мясцовай Дружынай Згуртаваньня Беларускіх Камбатантаў.

Сьвяткаваньне распачалося паніхідай за супакой паўшых Гэрояў, адслужанай а. А. Крытам у англіканскай царкве сьв. Яна Евангелістага. Апрача Беларусаў, на паніхідзе былі прысутныя таксама Украінцы й Казакі. Усе ўдзельнікі ізь сьвечкамі ў руках, стоялы на каленьнях, шчыра й сардэчна маліліся да Ўсемагутнага, а некаторыя навет ізь сьлязьмі ў вачох, каб дапамог Бог хутчэй вярнуцца ў вольную й незалежную Бацькаўшчыну. Перад паніхідай а. Аляксандар сказаў глыбока рэлігійнае казаньне, у якім заклікаў маліцца за ўсіх, што палі ў змаганьні за вольнасьць Бацькаўшчыны або сталіся ахвярамі крывавага бальшавіцкага тэрору.

Акамэмія адбылася ў Беларускім Клюбе, якую адкрыў старшыня Дружыны ЗБК сп. Б. Кляйноў, вітаючы ўсіх гасьцей і прысутных ды дзякуючы ім за прыбыцьцё. Пасьля абшырнага рэфэрату аб Слуцкім Паўстаньні, які прачытаў сп. М. Яськевіч, была ўшанаваная аднамінутнай цішынёй памяць гэраічных Случчакоў, а беларускі хор пад кіраўніцтвам а. З. Палякова прасьпяваў беларускі жалобны марш «Сьпі пад курганам гэрояў». Пасьля гэтага спад. М. Чудаўская прадэклямавала два патрыятычныя вершы: «Маці Беларусь» і «Юнаку» і атрымала бурныя воплескі.

Айцец А. Крыт зрабіў даклад аб жыцьці й дзейнасьці нядаўна памерлага сьв. пам. інж. Л. Рыдлеўскага, удзельніка Слуцкага Паўстаньня. Дакладчык глыбака схарактарызаваў ягонае жыцьцё й бязьмежную адданасьць беларускай справе.

Пасьля афіцыйнай часткі акадэміі беларускі хор пад кіраўніцтвам айца З. Палякова (Казак) надзвычай прыгожа выканаў некалькі беларускіх песьняў, за што і атрымаў бурныя воплескі ад прысутных. Усім харыстым належыцца шчырая падзяка, а асабліва а. З. Палякову, шчыраму прыяцелю Беларусаў.

М. Яськевіч

БРАДФОРД (АНГЕЛЬШЧЫНА):

Беларусы гораду й аколіц сабраліся 28 лістапада ў сваім собскім Беларускім Доме, каб адзначыць 33-юю гадавіну Слуцкага Паўстаньня і ўшанаваць памяць паўшых Гэрояў — змагароў за вызваленьне Беларусі.

Урачыстасьць пачалася паніхідай за паўшых Случчакоў і ўсіх іншых, што аддалі сваё жыцьцё, каб жыла Бацькаўшчына. Айцец А. Крыт у сваім чулым жалобным казаньні закрануў сэрца кажнага прысутнага, напомніўшы, што няма тут бадай нікога, чые родныя або блізкія не загінулі ў баёх або ў ссылках толькі за тое, што змагаліся за праўду й вызваленьне роднага краю.

Афіцыяльную частку акадэміі адкрыў старшыня управы ЗБВБ у Ёркшыр сп. Я. Калбаса, пасьля чаго зьмястоўны рэфэрат аб нашых змагарох-гэроях прачытаў сп. А. Ражанец. Напасьледак дакладчык запрапанаваў прысутным уставаньнем і аднахвіліннай цішынёй ушанаваць памяць паўшых Гэрояў.

Сп. сп. П. Дзехцер і П. Паўлоўскі прачыталі вершы, прысьвечаныя Дню Гэрояў. На заканчэньне была ўшанаваная памяць нядаўна памерлага сьв. пам. інж. Л. Рыдлеўскага, актыўнага ўдзельніка Слуцкага Паўстаньня. Адсьпяваньнем «Сьпі пад курганам гэрояў» закончылася акадэмія, пасьля чаго была праведзеная зборка ахвяраў на каляднія падаркі для дзяцей у Нямеччыне.

Янка Крушына

КРЭЗО (ФРАНЦЫЯ):

Дня 22 лістапада сёлета Беларусы ў Крэзо адзначылі 33-юю гадавіну Слуцкага Паўстаньня. Стараньнем мясцовай філіі Аб'еднаньня Беларускіх Работнікаў у Францыі была наладжаная сьвяточная акадэмія ў залі мясцовага мэрства, на якую, апрача Беларусаў, прыбылі й госьці ад Украінцаў і Баўгараў.

Акадэмію адкрыў старшыня філіі сп. Нагорны, які прывітаў усіх прысутных, пасьля чаго была прасьпяваная песьня «Мы бойкая моладзь». Рэфэрат аб Слуцкім Паўстаньні прачытаў сп. Нагорны, пасьля якога аднамінутнай цішынёй была ўшанаваная памяць Слуцкіх Гэрояў і ўсіх тых, што палі ў змаганьні за вольнасьць і незалежнасьць Бацькаўшчыны. Кароткі ўспамін над сьвежымі магіламі зрабіў сп. Булыга, які прыпомніў аб жыцьці й заслугах трох вялікіх, што памерлі ў гэтым годзе: сьв. пам. М. Равенскага, Л. Рыдлеўскага і мітрапаліта Палікарпа, адзначаючы заслугі ўсіх трох для беларускага народу.

На артыстычную частку акадэміі зляжыліся патрыятычныя вершы, прадэклямаваныя сп. сп. Нагорным, Булыгам, Гасьцеявам і Рашкевічам. Адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гымну была закончаная акадэмія.

М. Булыга

КУПЛЯЙЦЕ! — ВЫПІСВАЙЦЕ! ЧЫТАЙЦЕ!

Новыя беларускія кніжкі — шэдэўры беларускае літаратуры Выдавецтва «Бацькаўшчыны»:

Паэма ЯКУБА КОЛАСА

„Новая Зямля“

зь вялікім крытычным артыкулам Р. Склюта.

Цана 3 амэрыканск. даляры або іхная раўнавартасьць у мясцовай валюце.

Драма ЯНКІ КУПАЛЫ ў 5-ёх актах

„Раськіданае Гняздо“

з крытычным артыкулам Р. Склюта. Цана 1 амэрыканскі даляр або ягоная раўнавартасьць у мясцовай валюце.

П'еса ў 4-ох дзеях ЯНКІ КУПАЛЫ

„Тутэйшыя“

з абшырным уступным крытычным нарысам Р. Склюта.

Цана 1,30 амэрык. даляраў або іхная раўнавартасьць у мясцовай валюце.

Сатырычная аповесьць АНДРЭЯ МРЫЯ

Запіскі Самсона Самасуя

Цана 1 амэрыканскі даляр або ягоная райнавартасьць у мясцовай валюце.

За перасылку плаціцца асобна. Купляць і выпісваць непасрэдна з Адміністрацыі «Бацькаўшчыны», ад нашага Фінансавага Прадстаўніка ў Бэльгіі (Janka Žučka, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique), а таксама з усіх нашых Прадстаўніцтваў у паасобных краінах.

Нашыя Прадстаўніцтвы

Ангельшчына:
Mr. Aleksander Lašuk, 97 Moore Park Road, London S. W. 6.

Бэльгія:
Zora Savionak, 19, Place Hoover, Louvain.

Данія:
J. Lobejko c/o H. C. Jensen, Leifsgade 6 III tv. Kobenhavn S.

Францыя:
a) **Zygfryd Puzowski,** 158, rue Jules Guesde Levaillois-Perret (Seine).
b) **Bonifacy Prytycki,** 17, rue Roger Salengro Lys les Lannoy (Nord).

Швэцыя:
Basil Lukaszyk c/o Hammer Ringvagen N. 123/III, Stockholm.

Аргентына:
Asociacion Bielorusa en la Argentina. Calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio, Prov. Buenos Aires.

Аўстралія:
Mr. Donat Jackievič, 60 Fisher St., East Brisbane, Q-ld.
b) **Mr. L. Pašynkouski,** 60 Stawell St. Burnley, Melbourne, Vic., Australia.
c) **Mr. Jan Čarneckj,** 306, Sandgate Rd., Shortland, N.S.W.
d) **Filip Dareuski, 18 Vindsor St., East Perth, W. A. Australia.**

Бразылія:
Carlos Cimafejčyk, Prasa 76, Tiridentes, Curitiba - Parana.

Канада:
Mr. W. Nowicki, 142 Gladstone Ave, Toronto, Ont.
b) **Mr. Franz Hankievich,** 3701 St. Dominique St., Montreal, Q.

ЗША:
a) **Mr. B. Danilovich,** 222 Suydam St., New Brunswick, N. J.
b) **Mr. M. Serdeczenko,** 7851 Sherwood Ave, Detroit 11, Mich.
c) **Mr. V. Duniec, 2502** W. 7. St., Cleveland, Ohio.
d) **Mr. E. Budzka,** 2042 W. St. Paul Ave Chicago 47, Illinois

Новая Зэляндыя:
Mr. Marian Karanieuski, 88, Hercules Drayve, Roxburg-Hydro.

З гэтых Прадстаўніцтваў просім у паасобных краінах выпісваць «Бацькаўшчыну» й на іх адрас перасылаць за яе належнасьць.

З прычыны дэвізовых абмежаваньняў просім усіх нашых Прадстаўнікоў выручаныя за газэту грошы, як і за выдадзеныя «Бацькаўшчынай» кніжкі, перасылаць на адрас нашага фінансавага Прадстаўніка ў Бэльгіі:
Janka Žučka, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011